Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навукарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 3 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтовага тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага першага тэксту 1 р. 50 к. Сялянскія на 50 проц. даражэй. Зменш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок — 35 к. За кожны радок — 15 к. Беспрадпл. і чарговапрадпл. за радок — 15 к. За кожны радок — 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх сакр.-тер. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА кантораю газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 30 (2519) Пятніца, 8-га лютага 1929 г.

Разыходзіны між краямі Прыбалтыкі

Ў СПРАВЕ ДАЛУЧЭНЬНЯ ДА МІРНАГА ПРАТАКОЛУ СССР.

ЭСТОНІЯ ПАДПІСВАЕ ПРАТАКОЛ НЕАДКЛАДНА.—ЛАТВІЯ НАМЕРАНА ДАЛУЧЫЦЦА ДА ПРАТАКОЛУ ПАЗЬНЕЙ.

РЫГА, 7-2. Агалошана афіцыйнае паведамленьне аб выніках нарады ў Рызе між эстонскім і латвійскім міністрамі замежных спраў—Латыкам і Балёлысам. У паведамленьні зазначана, што «Латвія і Эстонія гатовы падпісаць маскоўскі пратакол пры ўмове, калі яго адначасна падпішуць усе зацікаўленыя дзяржавы». Далей паведамленьне заяўляе, што «для гэтага пакт Келёга павінен быць ратыфікаваны паскораным парадкам», і што пасьля ратыфікацыі пакту «Эстонія ня бачыць падставы марудзіць з падпісаньнем пратаколу», але латвійскі міністр замежных спраў „жадае" ў пачатку высьветліць канчатковa пытаньне аб удзельніках пратаколу ягчэ на працягу гэтага тыдню».

Абмяркоўваючы гэтыя паведамленьні, «Латвіс» піша: «У галоўным палітычным пытаньні між Эстоніяй і Латвіяй не дасягнута згоды. Эстонія пойдзе, здаецца ўпаршыню, асобна ад Латвіі»

„Латвія не ўпаўнаважвала Польшчу".

РЫГА, 6-2. Расейская газэта «Сегодня Вечером» заўважае: „Пан з аўтарытэтных крыніц паведамляюць, што Латвія не ўпаўнаважвала Польшчу рабіць ад імя Латвіі якія-небудзь заявы. Між Латвіяй і Польшчай неў неска толькі звычайны абмен інфармацыяй наконт пытаньня аб падпісаньні пратаколу. Пры гэтым Латвія не давала ніякіх абавязацельстваў ці даручэньняў Польшчы. Як відаць, Патэк зрабіў сваю заяву ў Маскве, накіраўлена зрэзумбушы пункт гледжаньня Латвіі".

* * *

РЫГА, 6-II. Газэта „Яунае Зіннес" піша: «Латвія прытрымліваецца таго погляду, што яна можа дасць свой подпіс толькі у нарад у далучэньня пасьля падпісаньня пратаколу СССР і Польшчаю і пасьля таго, як пытаньне аб далучэньні будзе вырашана Фінляндыяй і Літвою. Эстонія, наадварот, лічыць патрэбным неадкладна падпісаць пратакол адначасна з Польшчай і Румыніяй. Як відаць, пагадзіць гэтыя погляды на ўдаецца, і Эстонія пойдзе ў гэтым пытаньні асобным шляхам. У латвійскіх урадавых колах лічаць, што Эстонія мае падставы падпісаць пратакол.

Замежная камісія ойму зацьвердзіла пакт Келёга і не адклала яго для ратыфікацыі ў сойм.

Камісія таксама ўхвеліла, што пратакол Літвінава нельга падпісваць разам з Польшчай і Румыніяй, але да яго можна далучыцца пазьней»

* * *

РЭВЕЛЬ, 6-2. «Пялевалехт» паведамляе, спасылаючыся на пэўныя весткі ў Эстоніі, што Эстонія і Латвія не падпішуць пратаколу Літвінава 7-га лютага, бо яны павінны ўпачатку пагадзіць свой адказ з поглядам на гэтае пытаньне парлямэнту.

„Посьпех савецкае дыпляматыі".

ЛЁНДАН, 6 2. Лібэральная «Манчэстэр Гардыян», абмяркоўваючы падыходзячае падпісаньне пратаколу Літвінава, які газэта называе «усходнім пактам Келёга», так піша: «Савецкі ўрад можна прывітаць з посьпехам яго дыпляматыі, у выніку якога 6 дзяржаў Усходняе Эўропы згуртоўваюцца ў агульным мэтафэсьце проці вайны».

Нямецкая газэта аб падпісаньні пратаколу.

БЭРЛІН. 6-2. Абмяркоўваючы падыходзячае падпісаньне пратаколу Літвінава, орган партыі цэнтру «Нямеччына» выказвае меркаваньні, што Амэрыка, зацікаўленая ў польскай экспэдыцыі, зрабіла ў данным выпадку на Польшчу нажым. «Бажуць,—піша газэта,—што, вярнуўшыся з Масквы, фінансавы дарадчык польскага банку, амэрыканец Дзюі, раіў польскаму ўраду абавязкова заснаваць добрыя адносіны з СССР. Парада гэтая, як відаць, зрабіла ўплыў. Трэба аднак, зазначыць што падпісаньне пакту Літвінава на зьнішчыць напружанасьці, якую пабыло украінскае пытаньне". Далей газэта піша: «Пасьля падпісаньня пратаколу СССР, Польшчай і Румыніяй польска-румынскі вайсковы саюз па сутнасьці траціць права на існаваньне. Пытаньне аб разроўненьні навбывае новую вусім асаблівую актуальнасьць".

У НЯМЕЧЧЫНЫ КАЛЯ 4-х МІЛІЁНАЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ

Дапамога беспрацоўнаму складае толькі дзесятую частку таго, што атрымлівае паліцэйская сабака.

ЛЁКАУТ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ПАШЫРАЕЦЦА НА ІНШ. РАЙЁНЫ

Выступленьне кампартыі ў абарону беспрацоўных.

БЭРЛІН, 6-II. Ва ўчарайшым пасяджэньні рэйхстагу камуністычная фракцыя ізноў затрабавала абмеркаваць пытаньне аб дапамозе беспрацоўным. Абгрунтоўваючы гэтыя патрабаваньні, камуністычны дэпутат Ядзаш зазначыў, што ў Нямеччыне зараз ёсьць 3.200.000 беспрацоўных і 800 тысяч, якія пазбаўлены запомогі. Калі паліцыйны членаў сем'яў беспрацоўных, дык выявіцца, што пятая частка ўсяго жыхарства Нямеччыны церпіць у сучасны мо мант ад беспрацоўя. Зазначыўшы, што ў пераважаючай большасьці выпадкаў беспрацоўныя атрымліваюць дапамогу ня больш 10-ці пфэнігаў у дзень (блізка 5 кап.), Ядзаш паказаў гатую дапамогу з зацьверджаньні рэйхстагам асыгнаваньнямі на утрыманьне палі эйскіх сабак, дзе на харчаваньне аднаго сабакі выдаецца ня менш 50 пфэнігаў. Згодна статыстыкі 1928 г., зарэгістравана 26 800 выпадкаў самазабойства на грунце голаду.

Выступіўшы з адказам міністр працы сацыял-дэмакрат Візель заявіў, што „няма патрэбы" павялічваць тей тарыф, у які беспрацоўны атрымлівае дапамогу.

Бойчыся магчымасьці новае дэманстрацыі беспрацоўных на трыбунах рэйхстагу, прызначаных для публікі, паліцыя разьмясьціла на трыбунах шматлікіх сыскных агентаў.

ДАЛЕЙШЫ НАСТУП НА ЗАРАБОТАК ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

БЭРЛІН, 6-2. Саюз прадпрыемцаў тэкстыльнае прамысловасьці Рэйнскага райёну абвясьціў аб адмове ад усіх існуючых згод з рабочымі 18 га лютага. Адначасна саюз прадпрыемцаў заявіў, што новыя згоды будуць падпісаны толькі ў тым выпадку, калі рабочыя згодзяцца на зьніжэньне заработку ня менш, чымся на 8,5 проц. у сярэднім.

Паліцыя перашкаджае працы Міжрабпому.

БЭРЛІН, 6-2. Паліцэйская ўлада ўсімі спосабамі перашкаджае дзейнасьці Міжрабпому ў справе падачы дапамогі бастуючым і лекаутаваным рабочым саксонска-турынгенскае тэкстыльнае прамысловасьці. У Геры паліцыя канфіскавала падпісныя лісты, па якіх Міжрабпом рабіў збор грашовых сродкаў. Учынкі паліцыі падтрымліваюцца мясцовымі муніцыпалітэтамі.

Перамога пад камуністычным кіраўніцтвам.

БЭРЛІН, 6-II Рабочыя аднаго з самых буйных мэталёрамысловых прадпрыемстваў у Мангейме, пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў левае прафсаюзнае мечэньні, з посьпехам правялі забастоўку проці мерказаных адміністрацыяй закладаў капіталістычнае „рацыяналізацыі". Забастоўка была абвешчана не зважаючы на тое, што рафармісцкія прафсаюзы не жадалі яе. Адміністрацыя пашла на ўступкі

Буржуазея Польшчы прагне голае дыктатуры.

Сойму пададзен рэакцыйны праэкт зьмены канстытуцыі

ВАРШАВА, 6 2. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Блёк супрацоўніцтва з урадам падаў сёньня ў сойм праэкт рэформы польскае канстытуцыі, які прадугледжвае значную зьмену і новыя правілы канстытуцыйнага жыцьця ў адпаведнасьці з патрэбамі сучаснага моманту. Згодна праэкту, прэзыдэнт рэспублікі павінен абірацца ўсеагульным галасаваньнем з ліку двух кандыдатаў, адзін з якіх намячаецца нацыянальным зборам (г. зн. соймам і сэнатам на аб'яднаным пасяджэньні), а другі —ранейшым прэзыдэнтам, паўнамоцтвы якога канчаюцца. Прэзыдэнту даецца, згодна праэкту, права накладаць вэта (забарону) на ўхваленьня парлямэнтам законапраэкты (г. зн. адмаўляць у зацьвярджэньні іх), выдаваць дэкрэты пасьля роспуску законадаўчых установаў, а таксама ў выпадку патрэбы, у часе перарыву між іх сэсіямі. Цэнз узросту для выбаршчыкаў пры выбарах у сойм устанаўляецца, згодна праэкту, у 24 гады, замест 21 году, як робіцца зараз; права быць абраным у сойм надаецца толькі асобам, якія дасягнуць 30-цігадовага ўзросту.

Згодна праэкту, лік сэнатараў абмяжоўваецца 15-цю; дзьве трэці сэнатараў абіраецца, а трэць назначаецца прэзыдэнтам»

Нашы заказы ў Польшчы.

„Работнік" (№ 35) паведамляе, што вядуцца перагаворы па справе аб узяленьні праз СССР вялікіх заказаў у Польшчы на сталёвыя і жалезныя вырабы на суму 1-1 з палов. мільёны даляраў.

Нешчасьлівыя выпадкі пры працы ў земляробстве.

З справаздачы польскіх інспэктароў працы вынікае, што па агульным ліку 18 903 выпадкаў у 1926 г. на земляробства і лясьніцтва выпадае 1411, з чаго на земляробства 854 і і на лясьніцтва 557. Сапраўды, лік ёсьць непараўнальна большы, бо на «Усх. Крэсах» выпадкі пры працы у земляробстве і лясьніцтве ня рэгіструюцца.

Беларуская гімназія ў Маладэчне.

«Дзеньнік Віл.» (№ 30) паведамляе, што б. сэнатар Уласаў зьвярнуўся ў віл. школьны куратор-ум з просьбай аб дазволе на адчыненьне беларускай гімназіі ў Маладэчне. У разе адмовы на адчыненьне гімназіі, магчыма, што ў Маладэчне будзе адчынена пачатковая школа імкнітэт Радашковіцкай.

Пратэст беларускіх паслоў.

Беларускія паслы казалі падалі пасьлядоўнаму паслу (нунцыю) у Варшаве пратест проці загаду віленскага арцыбіскупа Ялбжыкоўскага ў справе забароны чытаць „Бел. Крыніцу" і належэць да „Б-ва. Хрысьціянскай Дэмакратыі". Пратэст будзе адасланы ў Рым.

Пажар фабрыкі ў Згержу.

«Курэр Варш.» паведамляе, што 4 студзеня дашчэнту згарэла фабрыка Брадача ў Згержу. Агонь спаліў усю ўнутранасьць прадзільні. На фабрыцы працавала звыш 200 рабочых.

Арышты ў Новагрудчыне.

«Дзеньнік Віл.» (№ 29) паведамляе, што ў Баранавічах зьліквідаваны склад камуністычнай літаратуры баранавіцкай акругі. У сувязі з чым арыштаваны некалькі асоб.

Чаму ня выходзіць „З Працу".

Ужо больш месяца, як ня выходзіць у Вільні радыкальная беларуская газэта «За Працу».

Польская адміністрацыя асабліва ў апошнія часы сыстэматычна канфіскавала нумары газэты і нарэшце, каб канчаткова задушыць газэту, канфіскавала ў друкарні, дзе газэта друкавалася, увесь шрыфт газэты, чым фактычна спыніла далейшы яе выхад.

Такімі дзікімі спосабамі змагаюцца ў панская Польшчы з беларускім радыкальным друкам.

Орган старавабрадцаў.

У Вільні стаў выдавацца і выйшаў ужо першы нумар „Ведамасьцяў Галоўнай Рады старавабрадзкай царквы ў Вільні. „Ведамасьці" выходзяць на расейскай мове.

У Саюзных Рэспубліках.

Камсамол на варце выкананьня гаспадарчых плянаў.

УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ЗА ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ І ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

З адозвы ВСНГ СССР і РСФСР і ЦК УсеЛКСМ.

Центральны Камітэт УсеЛКСМ наладжвае ўсесаюзныя спаборніцтвы ў галіне зьнижэньня сабекошту і барацьбы за якасьць прадукцыі.

Пачатак усесаюзнага спаборніцтва супадае з распачатаю праверкаю выкананьня дырэктыў ураду аб зьнижэньні сабекошту прадукцыі. Удзел мясцовых камсамольскіх арганізацый у працы спэцыяльных праверачных камісій будзе пачаткам арганізаванае падрыхтоўкі і правядзеньня значнага грамадзка-паліт чнага і гаспадарчага пачынаньня камсамолу, разлічанага на доўгі перыяд усесаюзнага спаборніцтва ў галіне зьнижэньня сабекошту і барацьбы за якасьць прадукцыі.

У якасьці практычных мерапрыемстваў на перыяд працы спэцыяльных камісій прэзыдыум ВСНГ СССР і РСФСР і ЦК УсеЛКСМ раяць наступнае: 1) прыцягнуць у склад камісій і групп абследаваньня прадстаўнікоў ад камітэту і калектываў УсеЛКСМ; 2) шырэйш выкарыстаць мясцовыя заводы і двары для шырокага ўдзелу мас рабочае моладзі і дапамогі іх у працы камісій, а таксама для шырокага азнаямленьня з зад чамі і ходам усяе працы камісій; 3) на аснове вучоту заданьняў, даадзін з камісіям, нічыя камсамолу прадпрыемстваў, дзе праводзіцца абследаваньне, павінны залічаць рабочую моладзь заснаўп ць, дзеля дапамогі абследаваньню, ініцыятыўныя групы для вучэньня прагулаў, браку, прастою і расарэнаўні канкрэтных прапаноў. Вынікі працы гэтых груп павінны быць пакладзены ў аснову спаборніцтву за зьнижэньне сабекошту.

Акадэмія мусіць быць рэарганізавана.

ГОЛАС ВУЧОНЫХ ЛЕНІНГРАДУ І КАЗАНІ.

ЛЕНІНГРАД, 7-2. Праўленьне Ленінградзкага Унівэрсытэту ўхваліла пастанову, у якой зазначана, што, у зьвязку з забалётываньнем трох кандыдатаў—т. т. Фрычэ, Дэборына і Лукіна, у бліжэйшы час павінна быць праведзена ўсебаковае абследаваньне навуковае і грамадзкае дзейнасьці Акадэміі Навук і павінен быць перагледжан статут Акадэміі Навук, каб устанавіць час, на які павінны абірацца акадэмікі і наладзіць выбары з забясьпечаньнем найшырэйшага ўдзелу ў іх шырокіх грамадзкіх і вучоных мас.

КАЗАНЬ, 7-2. Пашырэны сход у габінэце марксызму ўхваліў рэзалюцыю, у якой рашуча пратэстуе проці дэманстрацыйнага неабраньня выдатных вучоных марксыстаў т. т. Лукіна, Дэборына і Фрычэ, высуўтых шматлікімі навуковымі ўстановамі СССР. Сход выказваецца за мэтазгоднасьць рэарганізацыі Акадэміі.

Новыя разьмеры паеў у спаж. каапэрацыі

МАСКВА. 7-2. У зьвязку з зацьвярджэньнем Саюзным СНК новымі правіламі аб пайных узносах у спажывецкія таварыствы, праўленьне Центрасаюзу ўчора разаслала ўсім каапэрацыйным арганізацыям інструкцыю, якая будзе служыць дадатакам да гэтых правіл. ДЛЯ ВЯСКОВАГА ЖЫХАРСТВА ўстанаўляецца ТРЫ разьмеры паёў: 10 руб. (для вызваленых ад сельска-гаспадарчага падатку), 25 р. (для тых, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак без надбаўкі і з надбаўкай) і 40 руб. (для тых, што плацяць падатак у індывідуальным парадку). Асобным распаўлікам і абласьцям дазволена зьмяняць гэтыя нормы у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі.

ПА РАБОЧА ГАРАДЗКОЙ КААПЭРАЦЫІ ўстаноўлены наступныя разьмеры паёў: 15 руб. для заробляючых да 50 руб. у месяц; 20 руб. пры заработку ад 50 р. да 100 р.; 30 руб. пры заработку ад 100 р. да 150 руб.; 40 руб. пры заработку ад 150 р. да 225 р. і 50 руб. пры заработку звыш 225 р. Для другіх члена ў сяміч, якія ня маюць самастоя нага заработку, паявы ўзнос як у сельскай, так і ў рабоча-гарадзкой каапэрацыі ўстанаўляецца ў разьмеры адна чвэрткі пая асноўнага члена сяміч. ПАНІЖАНЫ ПАЙ у разьмеры 5 р. устанаўляецца для наступных груп жыхарства: ДЛЯ БАТРАКОЎ, ІНВАЛІДАЎ ПРАЦЫ І ІНВАЛІДАЎ РСЧА, якія атрымліваюць дапамогі, ці пенсію ня звыш 20 р. у месяц, і для рабочых і служачых з заработкам ня звыш 20 руб. у месяц.

Праўленьне Центрасаюзу пастанавіла ВЫЗВАЛІЦЬ ад узноса пая ЎСІХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І ЧЫРВОНАФЛЁТЦАЎ І БЕСПРАЦОЎНЫХ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗАЎ.

Маючы на мэце ўзьняць матар'яльную зацікаўленасьць найшчыкаў, спажывецкія таварыствы, пры наяўнасьці прыбытку, будуць налічваць ДЫВІДЭНД на аплачаную суму пайовых узносаў У РАЗЬМЕРЫ 6-8 ПРОЦАНТАЎ ГАДАВЫХ.

44 новых фабрык збожжа.

МАСКВА, 6-2. Праўленьне збожжатрэсту канчаткова ўстанавіла і зацьвердзіла сьпіс савецкіх гаспадарак, якія распачнуць працаваць у 1929 годзе. У гэты сьпіс уваходзіць 44 збожжавыя савгасы, 10 з якіх фактычна распачалі працаваць яшчэ ў 1928 г. Агульны абшар зямлі, заняты савгасамі, дасягае 1.653 300 гэктараў. Вытворчы плян пашырэньня савгасаў складзен з такім разрахункам, каб у кампанію 1929 г. атрымаць 115 тысяч тон збожжа.

Па барацьбу з алкагалізмам.

МАСКВА. 6-II. СНК РСФСР разгледзеў шэраг прапаноў Малога СНК, які распрацаваў законапраэкт аб барацьбе з алкагалізмам. СНК даручыў Дзяржплану РСФСР у пяцігодзьдзі народнае гаспадарчі ўлічыць задачы барацьбы з алкагалізмам у адносінах скарачэньня вырабу і продажу гарэлкі. Гарадзкім саветам і саветам рабочых пасёлкаў дазволена пакуль зачыніць усе ці ны продажу гарэлкі. Пастановы гарадзкіх саветаў па гэтых пытаньнях праводзяцца ў жыцьцё неадкладна. Ва ўсе сьвяточныя дні, а таксама ў дні адпачынку, напярэдадні гэтых дзён і ў дні выдачы заработнае платы ў фабрычна-заводскіх раёнах новым законам забараняецца гандаль гарэлкаю. Ва ўсіх грамадзкіх, дзяржаўных, каапэрацыйных і прыватных сталоўках і закусачных забараняецца продаж гарэлкі і гарэлкавых вырабаў.

Далей СНК РСФСР прызнаў патрэбным забараніць розныя алкагольныя рэклямы, і не дазваляць выстаўкі алкагольных напіткаў. Наркамаздароўя атрымаў загад правесьці меры для узмацненьня культурнае барацьбы.

Збожжатрэст забясьпечвае савгасы спэцыялістамі.

МАСКВА. Праўленьне Збожжатрэсту ўтварыла шэраг угаворaў са спэцыялістамі, якія скончаць сёлета ВПУ і ВТНУ. Для гэтых студэнтаў Збожжатрэст дае стыпэндыі па 75 руб. у месяц. Навуковым установам выдзелены датацыі дзеля паскораньня выпуску і прыстасаваньня праграмы да патрабаваньняў Збожжатрэсту. Студэнты, якія падпісалі ўгаворы са Збожжатрэстам, абавязаны працаваць у савецкіх гаспадарках Збожжатрэсту ня менш 3-х гадоў.

Блізкі пачатак працы на Волга-Доне.

МАСКВА, 6 2. На пасяджэньні СНК РСФСР быў заслуханы даклад аб падрыхтоўцы да набудовы Волга-Донскае воднае магістралі. Выявілася, што набудова магістралі будзе каштаваць 193 мілёны руб. Магістраль можа быць набудавана ў працягу 6 гадоў.

СНК РСФСР налічыў патрэбным уключыць у першы пяцігадовы плян народнае гаспадаркі пачатак работы па набудове Волга-Донскае магістралі з тым, каб набудова была скончана ў наступнае пяцігодзьдзе.

Найбольшы выйгрыш.

АРЦЁМАЎСК, 5-II. Рабочы механічнага цэху мэталюргічнага заводу імя Рыкава падаў у мясцовае аддзяленьне Дзяржбанку аблігацыю 2-е пазыкі індустрыялізацыі, на якую ў першым тыражы прыпаў выйгрыш у 5 тысяч рублёў.

Прысуд „кабукам".

МАСКВА. 6 2. Учора ў 6 гадзін увечары, пасьля пяцігадзіннае нарады, маскоўскі губсуд пад старшынствам т. Сэгала ўхваліў прысуд па справе «Кабукі». Барнаваў, Васьняровіч і Давілаў прысуджаны да 3 год вызволеньня кожны з высылкай у далейшым па доўгі тэрмін у Нарым і да пазбаўленьня правоў на 3 гады. Навумаў і Іваноў засуджаны да 3-х гадоў вызволеньня кожны, рэшта—на менш час.

Аварыя дацкага параходу.

ЛЕНІНГРАД. 6-2. Дацкі параход «Лаўра Мэрэ», які ішоў у складзе каравану ў крыгах Фінскае затокі пад праводкаю лёдаколу «Ермак», пацярпеў аварыю.

Прычына вялікіх маразоў.

МАСКВА. У Бюро Надвор'я паведамілі прадстаўніку ТАСС, што прычына вялікіх маразоў апошніх дзён вызначаецца палярны антыцыклён. Хутка маразы агорнуць поўдзень і паўдзённы ўсход СССР. Ужо ўчора ў Фэадосіі і Эўпаторыі было 16 градусаў марозу. У сярэдняй паласе маразы затрымаюцца на 1-2 дні, а ў канцы тыдню пачнуць пацяплець. Маразы апошніх дзён, бясспрэчна не пашкодзяць ставу засеваў, бо засеў усходы засыпан добрым пластам сьнегу.

У МАСКВЕ 31 ГРАДУС МАРОЗУ.

МАСКВА, 6-2. Марозы ў Маскве дасягнуць 31 градусу і ўпесьлі бяз ладзьдзе ў вулічнае жыцьцё. Усходняе паліва ў печах выклікала шмат пажараў. Зарэгістравана да 80 выпадкаў пажарных команд. Сярод жыхарства шмат выпадкаў абмарожваньня. З раніцы 6 лютага школы былі зачынены.

У КІШЫНЁВЕ СУДЗЯЦЬ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН БЭСАРАБІІ.

ВЕНА, 6-II. Орган лібэральнае партыі «Віторул» паведамляе, што ў Кішынёве 11-га лютага распачнецца працэс сяброў бэсарабскага камітэту рабоча-сялянскага блёку, прыцягнутых да адказнасьці за перадвыбарчую агітацыю. Распрацаваны ўжо акт абвінавачаньня прыпісвае падсудным дэманстрацыю ў чесьць Чырвонай армії і СССР, проці румынскае ўлады і дзяржаўнае бязпасьнасьці.

Кішынёўскі орган рабоча-сялянскага блёку «Рабоча-Сялянская Праўда» агалашае адозву рабочых, у якой зазначае, што працэс зьяўляецца судом над рабочай клясай усяе Румыніі, і заклікае да масавых пратэстаў.

РАТЫФІКАЦЫЯ ПАКТУ КЕЛЁГА РЭЙХСТАГАМ.

БЭРЛІН, 6-2. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Рэйхстаг ухваліў у трэцім чытаньні пакт Келёга 287-ю проці 127 пі галасоў нацыяналістаў, камуністаў, нацыянал сацыялістаў, хрысьціянска-сацыяльнае і сялянскае партый.

Далей рэйхстаг зацьвердзіў пастанову камісіі рэйхстагу па замежных справах, якая прапануе агульнанямецкаму ўраду, у зьвязку з паданьнем правамоцнасьці пакту Келёга, дамагацца не ад урадамі краёў-удзельнікаў пакту і Лігаю Нацый, каб яны выканалі абавязацельствы ўсеагульнага разброеньня, а таксама каб былі пашыраны магчымасьці ўпарадкаваньня мірным шляхам існуючых і новых супярэчнасьцяй між інтарэсамі асобных народаў і выразных несправядлівасьцяй».

Пуанкарыстам не падабаецца савецка-нямецкае супрацоўніцтва.

ВЫПАД ПРОЦІ САВЕЦКА-НЯМЕЦКАЕ АРБІТРАЖНАЕ КАНВЭНЦЫІ.

ПАРЫЖ. Орган Коці «Гонуа» абмяркоўваючы савецка-нямецкую канвэнцыю аб трацейскім разглядзе спрэчных пытаньняў, заяўляе, што „Нямеччына і СССР складаюць на ўсходзе Эўропы палітычную групу, якая знаходзіцца па-за сфэраю дасяганьня Жэневы, групу здольную ў паўных вагах ня ўрунках паралізаваць гарантыі і санкцыі Лігі Нацый».

«СССР праз Нямеччыну можа прымусіць Жэневу прыслухоўвацца да яго, —піша „Гонуа"; „аднак, Ліга Нацый ня здольна рабіць уплыву праз Нямеччыну на СССР". Газэта задае запытаньне, як можна давяраць лёкарыскаму пацыфізму нямецкага ўраду, калі ён абавязуецца праз СССР закоўваць вэйтралітэт.

Буржуазея ня хоча вызваляць т. Марты.

ПАРЫЖ. 6 II. Ва ўчарайшым пасяджэньні палаты дэпутатаў Кашэн патрабаваў неадкладна вызваліць Марты. Палата адкінула абмеркаваньне патрабаваньня кампартыі да 6 лютага з прычыны абыцта таго, што мандат Марты павінен быць яшчэ зацьвердзан камісіяй. Урад хоча заняць у гэтым пытаньні такую-ж пазіцыю, як і 14 лістапада 1928 году, калі ў адказ на патрабаваньне аўтанамістаў вызваліць Рыклеча і Росса і патрабаваньне камуністаў вызваліць Кашэна, Дарыё і Дукле ізноў паставіў пытаньне аб даверы і атрымаў значную большасьць.

Між Нанкінам і Японіяй дасягнута згода.

ШАНХАЙ, 6 II. Японскі орган «Шанхай Ніцы Ніцы» паведамляе, что перамовы міністра замежных спраў нацыянальнага ўраду Ван Чэн-Ціна з японскім пасланнікам у Нітці Ішывазаю скончыліся добра. Зараз падрыхтоўваюцца акуманты, водгук якіх будзе «кіндзіцзы Цзынньсні інцыдэнт і ўстаноўлен парадак эвакуацыі Шандуньскае правінцыі.

Ішывазаю ў гутарцы з карэспандэнтам японскага агентства Тохо заявіў: «Не зважаючы на тое, што перамовы часам праходзілі вельмі абвострана, усё ж яны скончыліся па прыяцельскі». У кітайскім друку а куль-што не зьмянчалася якіх павод маленьняў аб умовах падпісаньня згоды. Мясцовыя японскія газэты паведамляюць, што Шандуньская правінцыя будзе эвакуавана ў лютым.

Падзеі ў Гішпаніі.

ПАРЫЖ. 6-2. З прыежных пунктаў ізноў надасланы паведамленьні аб усягульнай забастоўцы ў Айкаке (паўднёвы прамысловы цэнтр Гішпаніі)

Водгук ангельскіх крэдытаў, якія гішпанскіх пастаўшчыкаў Гэрра высьлі на Канарскія выспы.

ЦІКАВАСЬЦЬ АНГЕЛЬСКІХ ДЗЕЛАВІКОЎ ДА ГАНДЛЮ З СССР.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАСЫЛКІ Ў СССР ДЗЕЛАВОЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

ЛЁНДАН, 6-2. У Лёндане адбыўся вялікі сход прадстаўнікоў ангельскіх прамысловых і іншых дзелавых колаў, якія зацікаўлены ня пытаньнем аб разьвіцьці англа-савецкіх гандлёвых зносін. Сход аднагодна ўхваліў „неадкладна ўжыць захады для пасылкі дэлегацыі на асновах прадстаўніцтва з тым, каб гэтая дэлегацыя выехала ў Расею не пазьней 8-га сакавіка".

На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі больш чымся 20-ці буйных ангельскіх фірм.

Лібэральная «Дэйлі Кронікль» піша, што мэтаю дэлегацыі ангельскае прамысловасьці будзе „абмеркаваньне з прадстаўнікамі савецкага гандлю асноў пляну аднаўленьня гандлёвых зносін між абодвымі краямі на камэрцыйных пачатках". Газэта піша: «Пытаньне аб пазыцы для Расеі, якая дасьць ёй магчымасьць пашырыць свой гандаль з Англіяй, таксама, як відаць, будзе абмяркоўвацца».

Заснован „англа-расейскі к-т гандлю".

ЛЁНДАН, 6-2. Лёнданскі сход прамыслоўцаў, зацікаўленых у разьвіцьці гандлю в СССР, заснаваў «англа-расейскі камітэт».

Наконт намечанае арганізатарамі камітэту пасылкі дэлегацыі ў СССР „Ўінінг Стандарт" піша: «Гэтая пастанова зьяўляецца самай значнай падзеяй в часу разрыву зносін. Уплыў асоб, якія ўдзельнічалі на сходзе, вельмі вялікі, і значэньне ўхваленае ім пастановы цяжка пераацаніць».

Аднавіліся бойкі за Кабул.

ТЭРМЭЗ, 4-2. (На аўганскай мяжы). З Кабулу паведамляюць, што там распачынаюцца новыя бойкі між джалалабадцамі і кугістанцамі.

ЖЫХАРСТВА ГЕРАТУ ПАДТРЫМЛІВАЕ АМАНУЛУ.

ГЕРАТ, 1-2. Учора з Кандагару прыехаў на аўтамабілі спэцыяльны курэр ад Аманулы-хана да герацкага генэрал-губарнатара. На экстраным сходзе, скліканым 1 лютага губарнатарам, в удзелам прадстаўнікоў духоўніцтва, гарадзкога, вясковага і качэўнага жыхарства, была зачытана падпісаная ўласнаю рукою Аманулы адозва да жыхарства Герату і правінцыі. Адоітэі гатоў адозвы былі зараз-жа расклеены па горадзе. У сваёй адозве Аманула заклікае жыхарства Герацкае правінцыі салідарызавацца в кандагарцамі і спакойна чакаць далейшых загадаў з Кандагару. Прадстаўнікі духоўнікаў і усіх станаў напісалі ў адказ Аманулі ліст, у якім клянуцца падтрымаць яго ў барацьбе са здраднікамі і прадажнікамі незалежнасьці Аўганістану.

КАНСЭРВАТЫЎНЫ ЎРАД НАЦЯГВАЕ МАСКУ НЯЎМЕШВАНЬНЯ.

ЛЁНДАН, 7-2. У палаце вобшчын Чэмбэрлену было зроблена запытаньне ці прывозіў афіцыйна ангельскі ўрад кагонебудзь з канцыляраў на аўганскі трон, а таксама ці дае ён каму небудзь з іх прыцельскую дапамогу?». Чэмбэрлен адказаў, што ангельскі пасланьнік у Кабуле Гэмфры мае «неафіцыйны кантакт з фактычнаю ўладаю, якая панае ў горадзе, але наконт такіх пытаньняў, як, напрыклад, бязпасьнасьць чужаземцаў і іх эвакуацыя з Кабулу». Таксама, згодна слоў Чэмбэрлена, ангельскі консул у Кандагары мае «неафіцыйны кантакт» з урадам Аманулы.

Далей Чэмбэрлен заявіў, што ангельскі ўрад «зусім не намеран умешвацца ў аўганскія справы і падтрымліваць якінебудзь з бакоў, якія змагаюцца ў сучасны момант за ўладу».

ДАЛЕЙШЫ КРОК ДА ПРАФСАЮЗНАГА АДЗІНСТВА.

УГАВОР АБ ПРЫЯЗЬНІ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ТРАНСПАРТНІКАЎ СССР, СКАНДЫНАВІІ, ФРАНЦЫІ І ІРЛЯНДЫІ.

МАСКВА, 7-II. Учора адбылася нарада, якая абмяркоўвала пытаньне аб падпісаньні угавору аб супрацоўніцтве і прыязні між саюзамі транспартных рабочых СССР, Ірляндыі, Нарвегіі, Фінляндыі і Францыі. У выніку нарадаў удзельнікі нарады падпісалі угавор аб братэрскім супрацоўніцтве і прыязні транспартнікаў гэтых краёў. Потым нарада адзінагодна ў выніку разгляду аб гатовасьці барацьбы в васеннею кампаніяю, накіраванаю у першую чаргу проці СССР.

Нарада зьвярнула ася да транспартнікаў усіх краёў з заклікам падтрымаць Саюзнуюк х ужо 8-мы месяцы фінскіх партовых рабочых праз падачу ім матар'яльнае дапамогі і абвесьці ніякі байкоту пагрузкі і разгрузкі ці іншых удзелу на ўсіх партох.

У Саюзных Рэспубліках.

Камсамол на варце выкананьня гаспадарчых плянаў.

УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ЗА ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ І ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

З адозвы ВСНГ СССР і РСФСР і ЦК УсеЛКСМ.

Центральны Камітэт УсеЛКСМ наладжвае ўсесаюзныя спаборніцтвы

XII ЗЬЕЗД КП(б)Б.

Прывітаньне кіраўніку партыі—ЦК УсеКП(б).

XII зьезд Камуністычнае партыі бальшавікоў Беларусі пасылае гарачае бальшавіцкае прывітаньне калектыўнаму правадыру і кіраўніку партыі—ЦК УсеКП(б).

Пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) партыя ідзе вернымі крокамі да пабудовы сацыялізму.

Кіраўніцтва ЦК забясьпечыла правядзеньне ў жыцьцё пастановаў 15-га зьезду аб індустрыялізацыі краіны, аб узьняцьці сельскае гаспадаркі на аснове будаўніцтва саўгасаў, на аснове каапэраваньня і калектывізацыі дробных і драбнейшых селянскіх гаспадарак, забясьпечыла адзінства партыі і непарушанасьць саюзу пралетарыяту з асноўнымі масамі селянства.

ЦК своечасова завастрыў увагу ўсяе партыі на правым ухіле, як найбольш небясьпечным на даным адрэзку часу і на необходнасьці барацьбы з правай небясьпекай, пры непаслабленьні барацьбы з „левым» трацкісцкім ухілам і з розным прымірэнцтвам.

Бязьлітасная барацьба з контр-рэвалюцыйным трацкізмам стаіць у парадку дню перад кожнай арганізацыяй, перад кожным членам партыі. У шэрагах партыі няма месца прымірэнцтву ці спачуваньню да людзей, якія адмянуліся па той бок барыкад.

Зьезд заяўляе, што КП(б)Б паранейшаму высока трымае ленінскі сьцяг і ўпэўнена вядзе пад выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК УсеКП(б) шырокія масы працоўных Беларусі па ленінскаму шляху.

Прывітаньне Ленінскай „Правде“

XII зьезд КП(б)Б пасылае бальшавіцкае прывітаньне Цэнтральнаму органу Камуністычнае партыі—Ленінскай «Правде».

У эпоху сацыялістычнае рэканструкцыі, калі вера партыяй і рабочай клясай стаяць агромадныя задачы будаўніцтва, роля Ленінскае „Правды“, як калектыўнага агітатара-прапагандыста і арганізатара, асабліва вялікая.

Бальшавіцкая „Правда“ асьвятляе цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху да сацыялізму і адначасна дае партыі і рабочай клясе востра адточаную зброю ленінізму для перамогі гэтых цяжкасьцей, дае больш рашучага сацыялістычнага наступу на капіталістычныя элементы гораду і вёскі, дае поўнага выкарчаваньня нарэшце капіталізму.

Трапны і разломны ўдары «Правды», нанесеныя і нанасімыя ёю праваму найбольш небясьпечнаму адкрытаму апартуністычнаму ўхілу і «леваму» контрэвалюцыйнаму на справе трацкізму.

У сучасны момант, калі галоўную небясьпеку партыі стаў правы ўхіл, наша „Правда“ не паслабляючы барацьбы з рэшткамі трацкізму, пасьпяхова мабілізуе мілённую партыю ў барацьбе з адкрытым апартунізмам і прымірэнцтвам.

Няхай ж ве Цэнтральны Орган нашае партыі—старая бальшавіцкая «Правда»!

ПРЭЗЫДЫУМ XII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ.

(Ранішняе і вячэрняе пасяджэньні 7 лютага).

На ранішнім пасяджэньні працягваюцца спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту.

У спрэчках выступалі т. т. Садоўскі (Ворша), Грысевіч (сэкратар Бабруйскага АК КП(б)Б), Хакін, Нейланд (Магілеў), Новікаў, Гуревіч (Менск), Дзяніскевіч, Кувіца (Гомель), Гуревіч (Бабруйск), Кроцкаль (Чырвоная армія), Фе[illegible] (Ленінград), Аўсеенка, [illegible] (загадчык жанвідзелу), Платун (ЦК союзу працаўсьветы), Арашчук (Віцебск), Шаршеў (намесьнік дырэктара раённай электрастанцыі імя т. Сталіна) і апошнім выступаў т. Стасевіч—загадчык АПА ЦК КП(б)Б.

Зьезд атрымаў шэраг прывітальных тэлеграм.

На вячэрнім пасяджэньні працягваюцца спрэчкі па дакладу сэкратара ЦК т. Гамарніка.

У спрэчках выступалі т.т. Рабіновіч (Барысаў), Ігнатоўскі (Бел. Акадэмія Навук), Арашчук (Віцебск), Білуга (Менск), Баліцкі (Наркамасьветы), Прусакова (работніца) і Прышчэпаў (Наркамзем).

Пад гучныя воплескі і гукі аркестру зьяўляюцца ў залю зьезду дэлегацыі рабочых і Чырвонай арміі, якія прынялі вітаньне зьезду.

Ад Аб'яднанай Вайсковай Школы зьезд вітае курсант Зарэмбоўскі, які ад імя школы перадае зьезду брацкае прывітаньне і кажа, што школа добра разумее свае задачы і гатова на першаму заклику выступіць на абарону Саюзу ССР.

Т. Гузікоў перадае ад байцоў і камплектскладу Беларускай дывізіі імя Фрунзэ гарачае прывітаньне зьезду.

Ад работых і работніц Добрускай фабрыкі „Герой Працы“ віталі зьезд рабочы т. Хайкін і работніца т. Абозава, якія падкрэсьлілі, што толькі пад кіраўніцтвам кампартыі ім удалося вычысьціць з заводу ўсю спадчыну царызму, контр-рэвалюцыянэраў і апэтэмітаў. Рабочыя заводу добра разумеюць задачы, вызначаныя партыяй, і будуць далей расьпіраць і падымаць вытварчасьць фабрык.

Далей выступалі з прывітаньнем ад чыгуначнікаў ст. Жлобін т. Кірэеў, ад рабочых Менцкае т. Гаркавы, ад заводу «Пралетары» тав. Зубатаў і ад заводу дрэваапрацоўчнікаў і Бабруйскага камбінату т. Шкуроў.

Рабочыя адзначылі дасягненьні ў будаўніцтве, палітычны рост рабочае клясы і ўступленьне старых рабочых у партыю. Рабочыя запэўнівалі зьезд, што пад кіраўніцтвам кампартыі яны перачогуць усе цяжкасьці, усякія ўхілы і хістаньні, дапамогуць ачысьціць партыю ад шкодных элемэнтаў і паўтоўць яе перадавымі рабочымі. Ад спэцыялістаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі зьезд прывітаў т. Каплан, які адзначыў, што спэцыялісты лічаць сябе часткай рабочай клясы і разам з ёй пад кіраўніцтвам Ленінскай кампартыі будуць будаваць гасьлізм, выкідваючы з сваіх шэрагаў усё шкоднае.

З адказным словам ад імя зьезду выступіў т. Малаковіч. Т. Малаковіч заклікаў рабочых, чырвонаармейцаў і спэцыялістаў змагацца за выкананьне вытворчасьці працы, за вучобу і гнаць з свайго асяродку ўсё шкоднае і контр-рэвалюцыйнае.

Т. Малаковіч запэўніў, што зьезд аддасьць усе сілы, каб правільна, па ленінску разьвязаць усе палітычныя і эканамічныя пытаньні. (Доўгія воплескі).

ПАПРАЎКА.

У № 29 нашай газэты—за 7 лютага г. г.—на 2-й стар. „Азеньніну зьезду“ (2 я нал., 23 стр. зьверху) замест надрукаванага ...«ІНШЫХ прадстаўніноў рабочае клясы» трэба чытаць—ЛЕПШЫХ прадстаўніноў рабочае клясы“.

НА ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ.

Першыя вынікі справаздачнай кампаніі Менскага гарадзкога савету.

Справаздачная кампанія Менскага гарсавету поўнасьцю разгарнулася. Ужо праведзена каля 90 справазд. сходаў, у сярэднім на кожным сходзе выступала 16 чал.

Аб чым гаварылі выступаўшыя?

Вялікая колькасьць выступаўшых гаварыла аб непарадках з разьмеркаваньнем жыльлёвай плошчы як камгасам, так і жактамі.

Наогул, жакты замкнуліся, на прыкладзь у свой склад новых сяброў, несвоечасова праводзяць рамонты, санітарнае становішча дамоў дрэннае. Не забываюць выступаўшыя і прыватных дамаўласьнікаў. Апошніх называюцца на сваіх дамох, зусім не рэмонтуюць іх. І таму выбаршчыкі патрабуюць, каб гарсавет ужыў меры да ацабраньня буйных прыватных дамоў, якія безгаспадарча ўтрымоўваюцца.

Непакоіць рабочых і становішча вадазабясьпечаньня гораду.

Большасьць выступаўшых патрабуюць, каб гасавет ужыў самыя тэрміновыя мерапрыёмствы да перабудаваньня вадаправоду, бо пры сучасным яго становішчы немагчыма будзе поўнасьцю выкарыстаць каналізацыю, на якую патрачаны сотні тысяч рублёў.

Выступаўшыя адзначылі і дрэнную справу з асьвятленьнем акраін: у цэнтры сьветла, а на акраінах цёмна.

Выбаршчыкі гаварылі таксама шмат аб якасьці будаўніцтва.

Мы яшчэ не навучыліся добра і эканомна будаваць, шмат недахопаў ёсьць у будаўніцтве. Трэба ўсе пенькі ўлічыць, каб не паўтараць у наступным будаўнічым сезоне. Выбаршчыкі таксама патрабуюць ад Гарсавету павялічэньня колькасьці гасьцініц, бо ў часе з'ездаў, канфэрэнцый і нарадаў не хапае месца для прыехаўшых у дзьвюх саўецкіх гасьцініцах, прыватнікі на гэтым нажываюцца.

На справаздачных сходах гаварылі шмат і аб працы міліцыі. Калі ідзе рэчы які-небудзь выпадак, што патрабуе ўмяшаньня міліцыі, паставы міліцыянэр не аказвае дапамогі, бо ён на можа пакінуць пасту.

Пагэтаму выбаршчыкі патрабуюць павялічыць колькасьць міліцыянэраў на акраінах гораду. Апроч гэтага, выбаршчыкі патрабуюць паляпшэньня становішча міліцыянэраў.

Трэба адзначыць, што ў галіне охоны здароўя выступаўшыя ў большасьці адзначылі вялікія дасягненьні. Скарэдзіліся толькі, што дрэнна паставлена хуткая дапамога: раней быў аўтамабіль, а зараз яго няма. Неабходна гэткі набыць.

Прываказальная амбулятория па Нова-Маскоўскай вуліцы мае вельмі малое памяшканьне і зусім не прыстасавана для пропуску ліку хворых, якіх яна павінна абслужыць.

Шмат было выступленьняў па пытаньнях народнай асьветы, тэатру і кіно.

Рабочыя патрабуюць ад гарсавету зьнізіць кошт білетаў у кіно і тэатры, пашырыць школьнае будаўніцтва, павялічыць лік школ і іншых культурных устаноў на акраінах гораду.

Трэба адзначыць вялікую актыўнасьць жанчын-работніц у сёлетняю справаздачную кампанію гарсавету. Што датычыцца моладзі, дык яе удзел у справаздачных сходах вельмі нязначны.

Камсамольскія арганізацыі павінны ў гэтых адносінах ўжыць адведзеныя мерапрыёмствы да павялічэньня актыўнасьці рабочай моладзі.

Без падрыхтоўкі і кіраўніцтва.

Вёска Дубкі па палітычнаму настрою лічылася першай вёскай у Старобінскім раёне, бо ўсе мерапрыёмствы савецкае ўлады праводзіліся у вашай вёсны з вялікім посьпехам. Грунтуючыся на гэтым, райком партыі і нашыя вясковыя камуністы лічылі непатрэбным весьці шырокую работу сярод беднаты па падрыхтоўцы яе да перавыбараў сельсавету. Уся вашая падрыхтоўчая праца вылілася ў правядзе ьві аднаго сходу беднаты, дзе былі абмеркаваны кандыдатуры ў сельсавет, праўда, камсамольцы праводзілі шмат гутарак з беднякамі па гэтаму пытаньню і інш., арганізавалі частку беднаты.

Зусім іншую працу вяла заможная частка вёскі пад кіраўніцтвам Шарко Сяргея і Шуневіча Алеся, якія вялі штодзённую работу сярод серадняцкай супроць кандыдатур, высунутых сходам беднаты. Шарко С., як сябра рэвізійнай камісіі Старобінскага сельскагаспадарчага кредытнага таварыства і гандлёвага агенту апошняга, удалося заваяваць на свой бок серадняцкую і частку беднаты. У часе перавыбараў яны селі ў адным кутку і высунулі сваіх кандыдатаў і пачалі галасаваць супроць кандыдатур, рэкамэндуемых сходам беднаты. Тых беднякоў, якія паналіся ў іх групу падкулачнікаў, яны трымалі за рукі, каб тыя не галасавалі за сваіх кандыдатаў, спэцыям у гэтай справе выказаў сябе падкулачнік Шарко Харытон.

Але ва актыўнасьці кулацкая частка беднаты [illegible] з камсамольскай ячэйкай адказала актыўнасьцю. Камсамольцы выкрылі ўчынкі ўсіх кулакоў і падкулачнікаў і ім удалося правесьці толькі аднаго свайго члена у сельсавет. Жанчыны-бяднячкі ў перавыбарчым сходзе прынялі самы актыўны ўдзел. Вось адно характэрнае выступленьне жанчыны-бяднячкі Пратасей Домны:

—Таварышоў, рэкамэндуемых сходам беднаты нам трэба правесьці ў сельсавет, бо яны добра абараняць інтарэсы беднаты. Наогул кажучы, ня глядзячы на ўсякія спробы заможнікаў не правесьці ў сельсавет камсамольцаў, мы ўсё-ж такі правялі членамі сельсавету 2 кандыдатаў партыі, 2 камсамольцаў, 1 жанчыну-бяднячку і аднаго па сацыяльнаму становішчу беднага, але з [illegible], альбо як у нас такіх кулакоў называюць „падкулачніка“.

У далейшым райкому партыі трэба зьвярнуць увагу на нашу вёску і ўзмацніць працу сярод беднаты, каб вырваць яе з пад упливу Шарко С. і Шуневіча А.

Шарко Ю.

Непадрыхтаванасьць адбілася на перавыбарах.

Першымі ў Дрыбінскім раёне, што на Аршанчыне, скончыліся перавыбары Гаспадарўска а с.-с.

Можа таму, што «першы блін заўсёды комам выходзе», выбнікамі перавыбараў нельга пахваліцца. Прысутнічала на перавыбарах толькі 45 пр. выбаршчыкаў, з якіх толькі 15 проц. жанчын. Абрана ў с.-с. 30 сяброў, з якіх толькі 5 жанчын. Склад с.-с. бяднякоў-серадняцкі, выключаючы 2 прадстаўнікоў ад заможнікаў.

Малы процант выбаршчыкаў тлумачылі ўмовамі хутарскога расьселеньня, але не заўсёды гэта было так. Тут можна назіраць і некаторую выдбальнасьць.

У в. Гаспадах позны на перавыбарчыя сходы разасьлалі яшчэ тыдні за два да сходу. Раздавалі іх агулам на ўсю сям'ю, а часта сустрэчаному дзядзьку для перадачы суседу. Гэтыя адносіны паразілі тое, што некаторыя двары позваў зусім не атрымлівалі.

Такім чынам здарылася тое, што на выбарчыя сходы не зьявілася ў в. Гаспадах па абодвых вучастках і патрэбнага ліку выбаршчыкаў. Каб ня быў сарваны сход, прыходзілася ў час сходу зьбіраць людзей спэцыяльна в бліжэйшых хутароў, калі зьяўляліся да дзядзькі, то ён з печы пытаў:

— А ці сёньня які сход? Я ўжо і запамятаў.

Можа-а, вядома, і запамятаваць, бо дырэктывы аб тым, каб папярэдніць выбаршчыкаў дазаткова і ў дзень сходу ня былі выканаць. Тут прапулены былі бюракратычныя адносіны да справы—абмежаванасьць рассылкай позваў.

На сходах прысутнічала беднота і заможнікі. Беднота таму, што перад агульнымі сходамі праводзіліся бядняцкія сходы, дзе яны яскрава ўявілі сваю ролю ў перавыборах, а заможнікі самі не прамаргаюць магчымасьці ўстроіць свае справы.

Абодвы бакі былі добра падрыхтаваны, а таму славесная перастрэлка асабліва не было. Праўда, выкідвалі слоўцы: «лодыры», „беднота“, «трэба ўсім плаціць падатак», „хто на плоціць падатку, ўстаў і зямлю трэба адабраць“, «нас разарылі» і г. д. але гэтыя словы—не навіна, іх часта можна пачуць ад заможніка. Затое атака ў час галасаваньня была дружная. За кандыдатур беднаты галасавалі беднякі і сераднякі, але ня ўсе, была частка і з заможнікамі, але кандыдатуры беднаты пераважна праходзілі большасьцю галасоў.

Малы процант абраных жанчын тлумачыцца простым неразьвіваньнем задач па ўдзяньню жанчын у саветы. Было прадугледжана «безразьличнае».

На справаздачным сходзе прымалі наказ дэпутатам, але у абгаварэньні я о амаль ніхто ня ўдзел нічаў. Пасьля зачытваньня наказу, выпрацаванага РКП(б)Б, казалі: «Ну што там яшчэ яго абгаварваць, дапаўняць, ці зьмяняць! Добра! Хай толькі выпаўняць тое, што напісана і будзе добра»!

Ня ўжо ўсё добра? Праўда, наказ канкрэтна ахапіў усе бакі жыцьця і першачарговыя задачы, але гэта ня знача, што ўсё добра і няма на чым застанавіцца.

На сходах прысутнічала беднота і заможнікі. Беднота таму, што перад агульнымі сходамі праводзіліся бядняцкія сходы, дзе яны яскрава ўявілі сваю ролю ў перавыборах, а заможнікі самі не прамаргаюць магчымасьці ўстроіць свае справы.

Абодвы бакі былі добра падрыхтаваны, а таму славесная перастрэлка асабліва не было. Праўда, выкідвалі слоўцы: «лодыры», „беднота“, «трэба ўсім плаціць падатак», „хто на плоціць падатку, ўстаў і зямлю трэба адабраць“, «нас разарылі» і г. д. але гэтыя словы—не навіна, іх часта можна пачуць ад заможніка. Затое атака ў час галасаваньня была дружная. За кандыдатур беднаты галасавалі беднякі і сераднякі, але ня ўсе, была частка і з заможнікамі, але кандыдатуры беднаты пераважна праходзілі большасьцю галасоў.

Малы процант абраных жанчын тлумачыцца простым неразьвіваньнем задач па ўдзяньню жанчын у саветы. Было прадугледжана «безразьличнае».

На справаздачным сходзе прымалі наказ дэпутатам, але у абгаварэньні я о амаль ніхто ня ўдзел нічаў. Пасьля зачытваньня наказу, выпрацаванага РКП(б)Б, казалі: «Ну што там яшчэ яго абгаварваць, дапаўняць, ці зьмяняць! Добра! Хай толькі выпаўняць тое, што напісана і будзе добра»!

Ня ўжо ўсё добра? Праўда, наказ канкрэтна ахапіў усе бакі жыцьця і першачарговыя задачы, але гэта ня знача, што ўсё добра і няма на чым застанавіцца.

„Хай толькі выканаюць“. Гэта кажа за тое, што ў абіральнікаў ёсьць нявера ў яго выкананьне, бо ня ўсе было выканана саветам у мінулы раз. Гэта заўважана ў час справаздачнай кампаніі, якая прыходзілася напярэдадні перавыбарчай кампаніі.

Хоць сельсав. і не дужа «адчытвалі», бо наконт самакрытыкі ў нас не таго..., але-ж і разьвярнуць яе нельга было па дакладу, папершае таму, што тут адбілася дырэктыва аб тым, каб у справаздачы было менш сухіх лічбаў, а падругое, што рэвізійная камісія разам з сельсаветам не рабіла справаздачы.

На адным сходзе, праўда, адчытвалася рэвкамісія і старшыня яе чыста-сардэчна выклаў, што яны ня толькі нічога не рабілі, але і ня ведалі сваіх задач. Такім чынам, справаздача мела такі, прыблізна, зьмест: — «Нам давяліся дырэктывы... Мы выконвалі дырэктывы... і г. д. Ну, а раз працавалі па дырэктывах, то тут і казаць нама чаго і... маўчалі ў большасьці

А што канкрэтна зроблена і чаго ня зроблена—аб гэтым амаль не ўпаміналася.

Трэба прызнацца, што было шмат і недахопаў. Адно тое, што не працавала ні адна камісія пры сельсавеце, што назіралася адарванасьць ад мас, што сябры сельсавету мала правяла і, што ня было актыву пры сельсавеце, варадзілі шмат памылак і недахопаў, якія і засталіся нявыяўленымі.

Х. А.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

МЯСЦОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ РАСЬЦЕ

У м. Копылі скончана пабудова 3 хпавярховага будынку для камбінату. Зараз ідзе к канцу абсталяваньне раённай электра станцыі, якая будзе пушчана 15 сакавіка. Станцыя дасьць электрычнае асьвятленьне ў м. Копылі, 3-х бліжэйшых калгасах і 1 савгасе.

У Талешчаніцкім раёне скончана пабудова камбінату ў Рудні на р. Дзьвіноце. У склад камбінату ўваходзяць млын, лесапільня і сукнавалкі. ГЭС ня выконвае заказу на абсталяваньне электрастанцыі, што перашкаджае пусьціць у ход прадпрыемства камбінату. Гэта электрастанцыя будзе даваць электрычнае асьвятленьне д. 4 бліжэйшых вёсак і камбінат.

У Бягомлі таксама скончана пабудова камбінату, які ўжо пушчан у ход. Электрастанцыя камбінату дае асьвятленьне Бягомлы. Заканчваецца пабудова 3 хпавярховага будынку для Бярэзінскага камбінату. У Зембіне камбінат ужо скончан і пачаў дзейнічаць. Электрастанцыя камбінату дае сьвятло для мястэчка. Пабудова гэтага камбінату каштавала 50.000 руб.

У г. Барысаве скончана пабудова і абсталяваньне скуранога заводу, на якім будзе працаваць 75 рабочых. Завод пачне працаваць з 10 лютага.

Рыхтуемся да вясеньняй сяўбы.

Валынцы (Полачч на), 7 2. Распачата падрыхтоўка да вясеньняе пасеўкампаніі. Агранамічныя сілы адносяцца да гэтае справы ўважліва і з адказнасьцю. Райён падзелен на 6 пунктаў, абслугоўваныя 6 зерноачысьціцельнымі абозамі, з якіх кожны састаіць з трох асноўных машын: трыер, сартыроўка і ільнаачыстка. Усяго да гэтага часу ачышчана каля 2500 пудоў насеньня. Зараз прыступлена да ачысткі 1200 пудоў ільнанасеньня. Вызначана да вясеньняй сяўбы ачысьціць 480 тон яравога зярна і 80 тон ільнанасеньня.

Па ўсіх сельсаветах робяцца сходы і гутаркі аб карысьці зерноачышчэньня. Сабраны таксама ад сялян заявы на штучнае ўгнаеньне, якога па райёну будзе рэалізавана: суперфосфату 48 тыс. пудоў, фасфар. мукі—800 п., тамашлаку—каля 3 тыс. п. і інш. больш 1 тыс. пуд.

Мяцоца ад сялян заявы на розныя кармавыя травы як напр. канюшчыны—1200 п., цімафейкі—270 п., лучэбіну—600 пуд., віку—6000 п. Паколькі у мінулым годзе быў неўрод і ў гэтым годзе маецца недастачасьць насеньня, для поўнага забясьпечаньня сялян намячаецца прывезьці ў р-н насеньня: ячменю—каля 6000 п., аўса каля 30 з пал. тыс. пудоў, сартавае насеньня аўса і ячменю—900 950 п., ільну—6 тыс. пудоў.

Будуць таксама праведзены на райёне ў 4 пунктах агранамічныя курсы. А трэба адзначыць незаступоны ўдзел у гэтай кампаніі камсамольскіх вачэйкі. Павінны адыграць вялікую ролю ў добрым праведзеньні падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Мік. С.

На фронце антырэлігійнае працы.

БАРЫСАЎ, 7 II. У горадзе адбылася першая канфэрэнцыя «Саюзу бязбожнікаў».

Характэрнымі рысамі канфэрэнцыі зьявілася абмеркаваньне метадаў антырэлігійнай працы ў сувязі з некаторым пашырэньнем рэлігійных сект. Задачы на далейшую працу канфэрэнцыя паставіла наступныя: пашырэньне выпіскі антырэлігійнай літаратуры і газэт, якой яшчэ ня досыць добра забясьпечаны клюбы, яч. «СБ», а таксама пашырэньне падпіскі сярод рабочых; сыстэматычная работа па ўцягненьню ў яч. «СБ» як рабочых, так і сяброў КСМ і праца сярод пізнэраў, аб паляпшэньні сатаварыскай працы паміж ячэйкамі і абмен вопытам працы апошніх, а таксама і ўцягненьне асноўнай масы настаўнікага персаналу у гэтую працу.

Усе гэтыя мерапрыёмствы, ухваленыя канфэрэнцыяй прынятыя цалкам. Характэрна заўважыць, што па гораду ва ўсялякіх сэктах налічваецца ня ля 5 т. чал. Кіраўнікамі гэтых сект у большасьці зьяўляюцца гандляры, таксама жанчын знаходзіцца больш і пэнісьменных таксама.

Усе гэтыя рэлігійныя арганізацыі маюць у сябе 15 будынкаў і каля 4 чал. кіраўнікоў.

Адгэтуль, як вывіч, патрэбна больш зьвярнуць увагі на ўцягненьне працоўных мас, якія яшчэ ня зволіліся ад уплыву рэлігійнага дурману, у ячэйкі „Саюзу Бязбожнікаў“.

Янка Лашкевіч.

Ліквідуем няпісьменнасьць.

м Сіроціна, Віцебск. акр.

У 1928-29 навуч. годзе райсавет т ва „Прэч няпісьменнасьць“ разгарнуў працу па зьнічэньню няпісьменнасьці ў Сіроцінскім раёне. Усяго на раёну ахоплена 1411 чал., з іх жанчын 853 ч., мужчын 558 чал., батракоў 27 чал., дэлегатак 63 чал. і калгасьнікаў 39 чал.

У сучасны момант ліквпункты ставяць сваей мэтай пашырэньне культурнасьці сярод насельніцтва, дзеля гэтага праводзіцца выпіска газэт на калектыўных пачатках, арганізуюцца ячэйкі „ПН“, чырвоныя куткі, працытываюцца лекцыі і ставяцца спэктаклі, у якіх прымаюць удзел вучні ліквпункту. Цікава бачыць, калі страха 40 год на ведаўны, што тэксцэна і артыст, заграміраваўшыся выконвае тую ці іншую ролю.

Нашы ліквпункты паступова кроч а кроком змагаюцца з цемрай і на культурнасьцю вёскі, і калі раней мы бачылі ў вёсцы карцёжную игру і п'янства, то зараз там маюцца чырвоныя куткі, куды выпісваюцца газэты і часопісі.

Робяцца пастаноўкі спэктакляў, якія зьяўляцца ня толькі моладзі, але і старэйшае насельніцтва.

Кузьмін.

За продаж фунтавога збору—да адказнасьці.

(в. Рудня, Чэрвенскі раён).

Гаспадары млыну Эпштэйны Давід і Бэнся ўхіталіся, атрымліваючы ад сялян фунты, не заносіць усяго ў квіткі, абвешвалі сялян, бралі больш, чым устаноўлена. Утворана была рэвізія і выявілася, што жыта 80 п. не хапае, як лічыцца па карашкох квіткоў, а зярна другіх культур больш чым лічыцца па квітках.

Пры расьсьледваньні выявілася, што жыта Эпштэйны збывалі прыватным гандлярам, а таксама, што ашуквалі і абвешвалі сялян.

26 студзеня Эпштэйнаў судзіла выязная сэсія Нарсуду 9 вуч. Быў Менску правабаронца, але і гэта не дапамагло. Злачынства ўстаноўлена суд прыгаварыў Эпштэйнаў да штрафу на 1000 р. кожнага.

Вяснор.

Сельскую гаспадарку—на сацыялістычныя рэйкі.

З прамовы т. А. І. Рыкава на 2-м усерасейскім агранамічным зьезьдзе.

Той рэжым і тыя ўмовы, якія склаліся для сельскай гаспадаркі ў пасьлякастрычніцкавы перыяд, у корані адрозьніваюцца ад усяго ранейшага. Ня было да гэтага часу ў гісторыі чалавецтва такой краіны, у якой з поўнай пасьлядоўнасьцю была-б праведзена нацыяналізацыя зямлі, як у нас. Ня было такога прыкладу ў гісторыі, дзе самі б вытворцы былі арганізаваны ў сыстэму саветаў і сталі ля ўлады, дзе ўсе натугі ўлады былі-б накіраваны на найбольш поўнае разьвіцьцё вызьворчых сіл. Ня было да гэтага часу краіны, у якой каапэрацыя адыгрывала-б такую ролю ў сельскай гаспадарцы, якую яна адыгрывае у нас. Ня было такой дзяржавы, якая ў адносіне да сельскай гаспадаркі вяла-б актыўную палітыку на падставе адзінага гаспадарчага пляну і якая для ажыцьцяўленьня гэтых плянаў была-б узброена такімі магутнымі рычагамі ўзьдзейнічаньня, якімі ўладае рэспубліка саветаў. Параўнайце магчымасьці разьвіцьця гаспадаркі пры рэжыме, які прывянае прыватную ўласнасьць, в магчымасьцямі савецкага ладу, і вы ўбачыце вельмі вялікую розьніцу. Пасьпрабуйце правесьці агульнае землеўпарадкаваньне ў якой-небудзь буржуазнай краіне і вы знойдзеце ў прыватнай уласнасьці на зямлю непераможныя перашкоды для гэтага. Кастрычніцкая рэвалюцыя, скасаваўшы прыватную ўласнасьць на зямлю, зьнішчыла найбуйнейшыя перашкоды для такой арганізацыі сельскай гаспадаркі, якая грунтуецца на найлепшым скарыстаньні натуральных умоў і ўжываньня навукі. Праўда, раздробненасьць і індывідуальны характар селянскай гаспадаркі зьяўляцца перашкодай для рацыянальнай арганізацыі с.-г. вытворчасьці; толькі поўнае абагуленьне вытворчых працэсаў, г. зн. плянавая арганізацыя працы ў галіне земляробства паставіць яго на адзін узровень з буйнай фабрычна-заводзкай вытворчасьцю. Але і дробны вытворца ў умовах савецкай краіны мае больш магчымасьцяй для разьвіцьця сваёй гаспадаркі, чымся у іншай краіне. Гэту зьмену, унесеную Кастрычніцкавай рэвалюцыяй, в асаблівай яскравасьцю можна характарызаваць тым, што робіцца ў прамысловасьці. Да Кастрычніцкавай рэвалюцыі, напрыклад, нафтавы Бакінскі раён быў надзелен паміж кавкурыўчыкі ўласьнікамі і пагэтаму магчымасьць мэтазгоднай, якая-б лічылася з натуральнымі ўмовамі месцараджэньня нафты, эксплёатацыі гэтага раёну была выключана. Або другі прыклад. Ажыцьцяўленьне электрыфікацыі ў нашай краіне адбываецца зусім у іншых умовах, чымся у любой буржуазнай краіне, дзе прыходзіцца утвараць дагаворы з асобнымі ўласьнікамі, нават для правядзеньня лініі электрычнай перадачы.

Усе гэтыя станоўчыя фактары і перавагі нашага ладу ў тых ці іншых выпадках скажаюцца нашай косасьцю, адсталасьцю, няуменьнем працаваць, цэлым шэрагам памылак, якія мы робім часамі ў нашых плянах. Але гэта, аднак, не адмяняе таго, што аб'ектыўныя умовы, уласьцівыя новаму ладу, адкрываюць вялікія магчымасьці разьвіцьцю сельскай гаспадаркі і ўжываньня навуковых даных у галіне земляробства.

Зразумела, усе вынаходкі агранома і ўсе яго парады могуць ужываца селянінам з посьпехам толькі пры ўмове, калі гэтыя агранамічныя мерапрыёмствы знаходзяць спрыяючую глебу у гаспадарчай зацікаўленасьці самога селянства. Колькі вы ні даводзьце селянам, што сеяць, напрыклад, пшаніцу або жыта лепш па-новаму (навуковаму), чым пастаному, селянін ня будзе гэтага рабіць, калі яму наогул невыгодна сеяць. Гэта зацікаўленасьць селяніна ўпіраецца ў палітыку.

Вопыт мінулых гадоў выявіў шэраг недахопаў у нашай податковай палітыцы. Гэтымі днямі будзе выдадзены новы закон аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку, які дае значныя ільготы серадняцкім масам селянства. Рэальныя паступленьні ад сел.-гасп. падатку сёлета вызначацца прыблізна ў 420—430 млн. руб. Калі б ня было несуразмерных раёнаў на Украіне, Паўночным Каўказе, дык гэтыя паступленьні павялічыліся-б яшчэ мільёнаў на 20—30.

Для будучага году мы прадугледжваем паступленьне па сельска-гаспадарчаму падатку ў 375 млн. руб., што азначае пры росьце сельскай гаспадаркі значае зьніжэньне падатку.

Апроч гэтага, будуць выявлены на 2 гады ад падатку новыя пасеўныя плошчы ва ўсіх тых раёнах, дзе абкладаньне робіцца па пасеву. Зразумела, гэтыя ільготы ня могуць распаўсюджвацца на выраслых кулацкія гаспадаркі, новыя пасевы якіх павінны быць аподаткаваны. Зьмены ў законе прадугледжваюць скідкі для тых гаспадарак, а іх праводзяць пералічаныя ў законе мерапрыёмствы для падвышэньня ўраджайнасьці. Малочная жывёла на маслярэбных раёнах будзе аподаткавана значна менш, чымся ў мінулым годзе. Новы закон падае вялікую устойлівасьць нормам абкладаньня, новычы іх стабільнымі на 3 гады. Вось галоўныя зьмены ў падатковай палітыцы, якія прымаюцца для паляпшэньня зацікаўленасьці селяніна сеяньня ў развіцьці яго гаспадаркі. Відаўнікія гаспадаркі, зразумела, як і раней, будуць вызвалены ад падатку. Гэтыя ільготы накіраваны па лініі стымулявання гаспадарчай дзейнасьці асноўнай фігуры сельскай гаспадаркі—серадняка. Новых ільгот у адносіне да калгасаў і каапэрацыі закон не прадугледжвае, бо ільготы, дадзеныя раней, досыць забясьпечваюць разьвіцьцё калгаснага руху і досыць запэўніваюць у ім селянскае насельніцтва.

Тое, што адбылося, у калгасным руху за апошнія гады, зазначае на магчымасьць пасьпяховага разьвіцьця яго і надалей. Нельга таіць, што, калі ўпершыню была высунута ідэя ўзмацненьня калгаснага руху, сярод навуковых працаўнікоў і часткі аграномаў было некаторае недаверце да новай, яшчэ не праверанай на вопыце, справы. Зараз гэтага хістаньня і гэтага недаверця ўжо няма. У гэтым найвялікшы посьпех. Будаваць сацыялізм толькі ў горадзе без прыцягненьня да будаўніцтва сацыялізму вёскі немагчыма. Нельга дазвусьціць, каб сацыялістычны горад і сацыялістычная прамысловасьць былі абкружаны вёскай, якая разьвіваецца па капіталістычнаму шляху. Плянава-сацыялістычная арганізацыя гаспадаркі ўключае ў сябе ня толькі прамысловасьць але і сельскую гаспадарку, якая зьяўляецца сыравінай і харчовай базай прамысловасьці і рынкам збыту апошняй. Але сацыялістычная арганізацыя сельскай гаспадаркі мае на ўвазе такую перабудову яе, пры якой, на падставе плянавай і рацыянальнай арганізацыі працы, яна будзе даваць больш хлеба пры меншых затратах. Адной з прычын адсталасьці сельскай гаспадаркі зьяўляецца яе здробненьне. Усмоктаньне сельска-гаспадарчай вытворчасьці праз каапэрацыю, калектывы і г. д. выводзіць яе з гэтага тупіка і дае ёй усе перавагі буйнай вытворчасьці. Пагэтаму курс на каапэрацыю і калектывізацыю зьяўляецца прагрэсыўным, рэвалюцыйным і з пункту гледжаньня самой тэхнікі сельскай гаспадаркі. Але гэта ня значыць, што пяперашнія дробныя індывідуальныя гаспадаркі ня маюць ніякіх перспэктыў для свайго разьвіцьця. Адсталасьць селянскай гаспадаркі пагэтулькі вялікая, што кожная дробная індывідуальная гаспадарка мае вялікія магчымасьці свайго разьвіцьця. Пагэтаму трэба дапамагчы і індывідуальнай гаспадарцы. Ёй трэба дапамагчы і таму, што ў бліжэйшыя гады ў валавай прадукцыі хлеба і ў забясьпечаньні краіны індывідуальная гаспадарка будзе яшчэ граць рашаючую ролю.

Гляньце, што робіцца ня толькі ў нас, але і ва ўсіх заходня-эўраўскіх краінах. Зроблена такая колькасьць новых навуковых вынаходак, створана столькі новых мэтадаў арганізацыі вытворчасьці, што і прамысловасьць і ў значнай ступені сельская гаспадарка перабудоўваюцца на новых тэхнічных асновах. Будуючы сацыялістычную грамаду, мы павінны ўсе навуковыя даныя, узьнімаючы прадукцыйнасьць працы чалавека на вялізную вышыню ужываць в большай сьмеласьцю, чымся ў любой буржуазнай краіне. Пагэтаму нашы навуковыя працаўнікі, аграном

ПРАВЕРКА--САМАКРЫТЫКА--КАНТРОЛЬ МАС

МЕНСКАЯ АКРЗЕМКАМІСІЯ АБАРАНЯЕ КУЛАКА.

(Барысаўскі райён).

На паперы Менская акрземкамісія запэўнівае, што яна стаіць за беднату, але на справе відаць ня тое. Вось, прыкладам можа паслужыць наступнае: роўна год таму назад, як зямляўпарадкаванцам была праведзена абрэзка зямлі ў заможніка в Лозіна Гарауская і абрэзанай зямлей быў вызелен бядняк другой вёскі. Прайшоў год, як Барысаўская райзямкамісія паслала справу гэту на зацьверджаньне акрземкамісіі, а апошняя замест таго, каб хутчэй скончыць гэту справу і прадаставіць карыстаньне зямлёй беднаку—запягвае справу другі год і гэтым дапамагае заможніку-кулаку.

Бядняк ходзіць в сельсавету ў РВК шукаючы парады што рабіць, але ні РВК, ні сельсавет дапамагчы ня могуць, бо не ад іх з лежыць, а кажуць, што залежыць ад акрземкамісіі.

Вось другі факт: у Мятчанскім сельсавеце, Барысаўскага райёну абрэзка кулацкіх гаспадарак была праведзена яшчэ ў 1925 годзе, але праз «нейкіх» людзей у б. Барысаўскай акрземкамісіі справа ляжала і пягнулася бяз выніку 3 гады і варэнце была спынена. Толькі ў 1928 г. Менскі акрэм пачынае справу з пачатку. Паслалі памоўніку, абразалі 4 кулацкія гаспадары (на 12 дзес. у кожнай) і вадзілі беззямельных і малазямельных гаспадароў. Праект абрэзкі зацьверджана Барысаўская РЗК (пакінуўшы кулацтаньне за кулакамі) і паслала справу на зацьверджаньне акрземкамісіі.

Прайшло больш паўгода, але аб справе нічога ня чуваць. Беднята абіваецца парогі, ходзячы ў РВК, сельсавет чакае канца чатырохгадовай валакіты, але канца, як відаць, няма. Паогул беднята страціла надзею на атрыманьне зямлі, бо кулакі іх запалохалі, што зямлі беднаце не атрымаць затым, што ў акрземкамісіі менскай засядацель нехта Грыгаровіч, найзепшы прыяцель і „рука“ аднаго абрэзанага кулака і Грыгаровіч, як засядацель, справу перароіць у процілеглы бок. Беднята гэтага баіцца, бо як прыказка кажа: „пакуль в багатага пух, дык в бедняка дух“. Акрэм гэтага, беднята баіцца ехаць у Менск на суд таму, што кулакі справу слухаць адкладуць і беднякі панясуць вялікія страты.

Паогул трэба сказаць, што валакіта на гэтай справе вядзецца пяты год і канца мабыць ня будзе. А беднята ходзіць упустую в сельсавету ў РВК чакаючы, што ўсё-ж будзе нарэшце, але Менская акрземкамісія відаць і ня думае аб гэтым. Трымаючы гэту справу пад «сукном» больш году. У такім выпадку чаму-ж ня радавацца кулакам і чаму ня сумаваць беднаце. Але калі і будзе канец, дык пеўдоа які, бо Грыгаровіч на словах кулакоў іх ок будзе трымаць. Адна надзея засталася на РСІ, можа апошняя дапаможа беднаце і спыніць чатырохгадовую валакіту і прыгледзіцца да Грыгаровіча—за каго ён стаіць і каго абаранае.

Цімох Цьвярозы.

Сосны шумяць...

Марозы—марозы... сьнягі. І ветры сьцюдзёныя, сібірскія; не на нашаму, не на беларускаму.

Завіруха скача «лявоніху» на полі, вецер адбівае на вокнах „кадрыль“, в стрэх врываецца салома і ляціць у дзікім вальсе на полю.

Узьбянтэжаны вецер налятае на бор і без даклада“ хлеціча на твары лес. Сосны шумяць, гудуць, завываюць на тысячу ладоў.

Інстынктыўна ўсім нутром адчуваеш, што сасновы бор просіць дапамогі, літасьці. Легендарны шум сто адовых сосен казытае нервы, наводзіць на бассыстэмныя, як і самы бор, думкі.

Гу-у-гу-у-у... гу-у-у.. шумяць макушкі сосен, завываюць рэбры суччаў, груба гудзяць стройныя ствалы.

А на іншары, за ло вішчам чутны музычныя нотаны прозьвічнай віліы... ці-лі-лі... цік.. дзі-нь... дз-з-з... Нявытрымлівае сасна волі людзей, пахіляецца—спачатку павольна, ледзь-ледзь, а потым з гулам, ламаючы крохкае сучча, палуе ледзяністы сьнег.

Ня толькі на іншары чуваць музыка віліы, ня толькі тут яна сьвяткуе свае перамогу. І у Катоўшчыне, і у Сунгаковым раву, і на Дзеразовым балоце спраўляе ўрачыстасьць зубчатая віла. Уся Полаччына, вялікая, гарыстая чуе гудзеньне бору, шум сосен і ведае аб сьвяце віліы. Чаноўнікі «шкадуюць» суровыя сосны, саранчлівыя бярозы і варосныя сьнегам елкі.

— Лес гіне! Лес гіне! Лес гіне! Шкадуюць не на словах, не у пратаколах, не ў закасьцянелых рэзалюцыях. Яны люцзя ня старага парадку, ня царскай «чаканкі»—людзі ў новай веры адн ладаюць сучасным санатрабаваньням, добраякасныя натуры, хоцьбы і ня вусім Х остаковы...

...«Беллес», «Дзьвіналес», «Лесзаг», «МБВ ж. д.» бацькі родныя лясоў Полаччыны. Вас паведамляюць, што аб гэтых арганізацыях можна напісаць дзесяткі томаў... Нявэрта. Мы можам і ў адным радку сказаць, што толькі «Лесзаг» і толькі за мінулы год даў страты дзяржаве больш паўтараста тысяч рублёў.

Маленькі прыклад. Гады паўтары таму назад „Лесгас“ пробіў загатоўку лесу ў адным з лясьніцтваў на пяцьдесят тысяч рублёў. Лес вывезьлі на прыгожа раскінуты курганчык, а летам з саліднасьцю заявілі:

— Купляйце.

Навакол прыгожа раскінутага курганчыка невядомая рука чарауніка альбо русалак стварыла непрахадзімую багну-балота, так што купцы адказалі:

— Калі ласка, лесзагаўцы, на плячох... на бераг...

Лесаматар'ял струхнеў, згніў. Пяцьдесят тысяч рублёў праваліліся, як залаты скарб у купальскую ноч у бесправесныя нетры балота.

Дрысенскае лясьніцтва робіць „правільчней“.

— Не шкада. Сячыце!

За адзін год лясы лясьніцтва страцілі лесаматар'ялу на адных дзесяць тысяч рублёў.

Полацкі лясны аддзел—«ідэйна—ідэалёгічны» кіраўнік «загаў», «белаў», «лесаў». Ён у ролі гогалеўскага «Рэвізора».

Калі патрабавалася рэвізія працы Дрысенскага лясьніцтва, то аддзел камандыраваў аднаго працаўніка, а тое, едучы ў вагоне «прямого сообщения» падумаўся на гэтай справе зарабіць камандыровачных і, забегшы ў бліжэйшае паштовае аддзяленьне, сьпешна тэлеграфуе ў Полацак:

— Справа заблытана кропка Ямчэ аднаго рэвізора кропка

Кізе другі рэвізор. Курань «Эпоху», пасьмейваюцца наўпрыкмепь і, лузгаючы семячкі, праводзяць «рэвізію».

Заінтрыгаваўся «сам» Інспэктар Лясоў. Паехаў.—Ды што ў вас за рэвізія?—усхваляваа закрычаў ён на нарозе.—Чапоўная, незаконная!

А праз гадзіну ў Полацку чыталі новую тэлеграму:

— Рэвізіі шліце бухгальтэра.

Чатыры чалавекі рабілі рэвізію маленькага, нішчаснага лясьніцтва цэлых два тыдні. Атрымлівалі камандыровачныя, сутачныя, дарожныя...

. . . . . .

...Сосны шумяць, завываюць, гудуць. Сосны надразаюцца вострымі зубамі віл, бярозы плачуць ад цяжкіх с кер.

Цім. Зарэчны.

Адкрыты ліст дзядзьку Якубоўскаму.

(Замест „паштовай скрынкі“).

Гладка пішаце, дзядзька Якубоўскі Восіп Міхайлавіч! І нават почаркам валаснога старасты. І нават лістом у рэдакцыю—«дазвольце вымясьціць мой ліст у вашай паважанай газэце «Савецкая Беларусь».

Зьмянчаем, калі ласка. Пішаце надалей. Залічым сталым карэспандэнтам. Гонарар будзем выплачваць. І нават без валакіты—штомесячна. Пішаце.

Але, ведаеце, маленькая заўвага: вельмі мякка вы абы одзіцеся з начальствам. Не па нашаму, на ў тон аддзелу «Самакрытыка—праверка--кантроль мас». Вось я, будучы на вашым месцы, напісаў-бы, напрыклад, так:

— «Цісьнуць, душнуць... дыхнуць не даюць... У Плешчаницах савецкай улады няма“..

І ў ё, ведаеце, з шматкроп'ем з шматкроп'ем... А потым скончыў-бы запальваючымі лёзунгамі:

— «За вызваленьне сялянства!

— За савецкую ўладу!

— За сусьветную рэвалюцыю!»

А вы вельмі ўжо мякка абыходзіцеся з начальствам, хоць і пішаце почаркам валаснога старасты. Трэба трапна, бяз літасьці біць ворага, ну, напрыклад... як я вас.

Але выбачаце, запамятаваў. Вас прыгнятаюць. Прыгон, кажаце? Нават больш. Каб толькі я быў старшынём райвыканкому, зараз-бы даў загад:

— Вызваліць Якубоўскага ад нападкаў!

Ухиляецеся? Добрым чалавекам называеце? Дзякую за ласку. Даверэ'е апраўдаю.

У вас дзесяць дзесяцін зямлі і восем сенажаці. Так? Адзін конь, адзін бык, тры каровы і сем птук дробнай жывёлы. Ня памыляюся? І яшчэ, як вы пішаце, у вас чатырыста сор к рублёў несезмяроўчага заработку. За гэта яны нагналі на вас 206 р. 45 к.

Гэта няправільна! Гэта скрыўленьне палітыкі партыі! Не пужайцеся, дзядзька Якубоўскі, я ўсім давяду, што вы іменна бядняк. І ня толькі бядняк, але і самы праўдзівы пралетарый! Гэта-ж вы з сынамі, адзін з якіх „сам сабой дайшоў у кавалі“, працуе на металічных заводах, на якіх нехта на вялікі прыбіў шыльду:

„ДЗЬВЕ КУЗЬНІ ГР-НА ЯКУБОЎСКАГА“.

І к таму вы добра разумеце, што прыгнушаць чалавека працаваць на сабе за нішчасную лустэ хлеба—дзіка і некультурна, а патэтаму экспляатацыяй не займаецеся, аб чым яскрава пішаце самі:

«Апроч пастуха, нікога наймнага няма». Я поўнасьцю салідарны з вамі і ў пацьверджаньне гэтага, успамінаю пецярбургскія газэты васемнаццатага веку: „прадаецца сабачка і дзяўчына“... „Па такой цане прадаюцца дарагія рэчы, цялушка, шчаняты і старая баба“...

Вы ўсё гэта робіце, як самы «дестэтэлны» дваранін, як пецярбурскі мусью васемнаццатага веку, а вас абвінавачваюць у экспляатацыі. Ды вы-ж ніводнага чалавека не экспляатуеце, у вас жа толькі пастух! А калі „курыца ня птушка, то пастух... не чалавек“.

Так, так... Вы занадта добры і чулы чалавек. Канцэлі для бяжняга не пашкадуеце. Пасьля... пасьля ня важна, што і тры здымеце... Кажаце, грошы суседзям пазычаеце. «Грошы пазычаю таму, што неабходна-ж дапамагчы чалавеку». Правільна. І Сіл Сілыч Абцуваў так пазычаў, але потым... Толькі праву—не дагадвайцеся, не на вашаму адрасу.

Паслухаем, што вы далей кажаце.— „Я, так сказаць, і культурную рэвалюцыю праводжу. І эканоміку ўздымаю. І на шматпольле перайшоў. Агранома слухаю».

Адразу відаць, што навейны чалавек. І на заводах працуе, на якіх нехта на вясьці прыбіў шыльду—„Дзьве кузьні гр-на Якубоўскага“, і сенажаці толькі шэсьць дзесяцін вас, і канцэлі для бяжняга, як Сіл Сілыч, не пашкадуе, і людзей не экспляатуе, апроч пастуха...

І як ні дзіўна, вам, маючаму такія пралетарскія адзнакі, выбарчая камісія падвесла падарунак... пазбавіла права голасу. За вашымі спакойнымі радкамі—„Калі пажадаеш выказацца на сходзе, то мне кажуць—маўчы“,— я бачу трагедыю чалавечай душы. Не серадняку, не бядняку, і не якому небудзь пастуху, а сапраўднаму пралетарыю—прапануюць маўчаць... Я ведаю, як у вас хвалюецца кроў ад гэтых слоў, як рукі часам заходзяць ходарам...

Але, ня глядзячы на гэта, дапамагчы вам не магу. Ні за што і ніяк.

. . . . . .

Пачакайце, па хвілінку... Нарадзілася рэзыкоўная думка... Мо' што і выйдзе... Сёньня-ж сядайце на дзягіл і ад'яжджайце да мяне... І возьмем, як вам сказаць... Каб справу вырашыць хутчэй... Заханіце заклажку самагону...

З гэтым і бывайце!

Цім. Рублёў.

Валакіта пры пакупцы драўнікны

Атрымаў Бяседзкі сельсавет ад райвыканкому вызначаную суму на водпуск лесу сялянам як дарчова, у крэдыт, так і за грошы. Разьмеркаваў сельсавет гэты лес паміж сялянамі, а таксама і яровы для апазу 25-га сьвежня 1928 году, і адаслаў увесь гэты матар'ял на зацьверджаньне ў Капаткевіцкую райлесгаміісію. Пр такола райлесгаміісі ад 9-га студзеня 1929 году гэты матар'ял зацьверджаецца і перасылаецца ў Птыцкае лясьніцтва для вытварэньня продажы сялянам лесматар'ялу і драўніны.

Сяляне на некалькі пар запцаў пататалі, ходзячы ў канцэлярыю сельсавету з пытаньнямі—калі пачнецца продаж лесу і дроў для апалу, а то прыходзіць зіма, няма дроў, прыходзіцца красьці ў лесе, хоць штраф прыдзецца плаціць.

У сельсавеце нічога не вядома пакоп тэрміну продажы лесу, і сяляне прыходзіцца ўхадзіць даноў, нічога не дабіўшыся. Потым у сельсавет прыходзіць адносіна Птыцкага лясьніцтва ад 15-1—29 г. за № 319, у якой прапануецца сельсавету ў 3-х дзённы тэрмін падрыхтаваць лікі для дармовага водпуску лесу сялянам, каб не затрымліваць водпуск, які скончыцца 1-га лютага г. г. Лікі падрыхтаваны, разданы сялянам. Насельніцтва чакае лясьнічага, а яго няма. Лес трэба. Што тут рабіць?

Праз некаторы час у канцэлярыю сельсавету прыходзіць паперка, што продажа лесу будзе вытвараецца ў в. Мышанка з 24-га студзеня да 1-га лютага 1929 г.

Атрымаўшы гэткае паведамленьне сельсавет зараз жа апавяшчаю усе вёскі. Пастаў доўгачаканы дзень 24 І. Усе грамадзяне пашлі ў в. Мышанку, чакаюць лясьнічага; ужо падыходзіць вечар, а яго няма. Некаторыя сяляне, не дачакаўшыся пашлі дамоў, а некаторыя засталіся чакаць. К вечару прыяжджае нам. лясьнічага. Сяляне кідаюцца адчыніць яму дзьверы. Ён разьдзяецца і кажа: «сёньня буду лес адпушчаць толькі мясцовым, а з другіх вёсак пасьля».

Так гр-не чакалі, чакалі, а дачакаўшыся пашлі з нічым даноў.

Ёрш.

КАНТРАКТАЦЫЮ ТРЭБА УПАРАДКАВАЦЬ

Кантрактацыя бэконных сьвіней зрываецца.

Пытаньне аб кантрактацыі бэконных сьвіней ягчэ было ўзьнята ў маі леташняга году; вельмі шмат гаварылі аб гэтым, шмат пісалі. Спачатку ўсе вашы гаспадарчыя і фінансавыя органы абяцалі сваю дапамогу Белдзяржгандлю, якому была даручана кантрактацыя бэконных сьвіней.

Але гэта было раньняй вясною, калі ва ўсіх гаспадарцаў быў вясельні настрой. Абяцалі вельмі шмат. І Белсельсаюз, і Наркамзем, і Белсельбанк, і іншыя гаварылі:

Экспарт (экспорт)—вялікая справа, трэба ў нас разьвіць гэты від экспарту, сказалі і гэтым абмежаваліся.

А час ішоў, вадышла вара працы, і тут толькі пачаліся гутаркі, пераговоры, дагаворы. Замест справы—гутарылі, замест кантрактацыі—спрачаліся, і ў пераговах «лета цэлае прапелі» і асенняю кантрактацыю прайгралі... Бо замест 5000 сьвіней, якія павінны быць закантрактаваны ўвосень, усяго аказалася пару сотняў.

Хто-ж вінаваты у зрыве кантрактацыі? Усе, бо кожны гаспадарца абвінавачваў другога, а той лаяў свайго, і ў выніку сяляне, у якіх можна было закантрактаваць падсьвінкаў, напрадавалі іх.

Наркамзем разаслаў вельмі красамоўныя абежнікі аб карысьці і неабходнасьці кантрактацыі і гэтым выканаў свой грамадзкі абавязак.

Сельсаюз у Віцебску спачатку абяцаў «залатыя горы», а ў выніку адмовіўся падпісаць загавор. Саўгасы і калгасы зусім не зьвярнулі ўвагі на гэту сур'ёзную і важную справу.

Вельмі кепска стаіць справа ў Мазырскім райёне, дзе райённыя зоотэхнікі зусім ня цікавяцца гэтай справай, не інфармуюць насельніцтва аб значэньні бэкону; гэтыя зоотэхнікі нават ні разу ня былі на месцы кантрактацыі, дзе праводзіцца кантрактацыя.

Вельмі пасыўна адносьліся да гэтага саўгасы; попытная станция ў Віцебскім райёне зусім адмовілася займацца такімі «глупствамі».

Якія-ж вынікі? Вельмі дрэнныя, бо да гэтага часу на заданьні вышэйшых органаў трэба было закантрактаваць 15.000 сьвіней, а закантрактавана усяго 1200 1500 штук.

Чаму гэта так здарылася? А таму, што ня было ніякае зацікаўленасьні, гаспадарцы толькі таргаваліся паміж сабой. Кожны пуд корму прыходзілася выпрашваць ад Саюзхлеба, прыходзілася бегаць па ўсіх фуражных аддзелах за высеўкамі і г. д.

Белдзяржгандаль пасылае першую партыю бэкона заграніцу, але гэта кропля ў моры, гэта толькі пробная партыя, трэба гэту справу шырока разгарнуць па ўсіх куткох Беларусі. Трэба ўмела растлумачыць насельніцтву карысьць кантрактацыі.

Леўскі.

У сямі нянек дзіця бязносае.

Ягчэ 13-га лістапада прэзыдыум Менскага АВК зацьверджаў арыентыровачныя лічбы на кантрактацыі. Заданьні Наркамзему і Белсельсаюзу былі своечасова разьмяркованы па райёнах і разасланы па месцах. Але прайшло ні больш, ні менш як 3 месяцы і Белсельсаюз, нарэшце, расчухаўся: 5 га лютага прыслаў Менскаму акрэм новыя зацьверджаныя лічбы на кантрактацыі. Прычым, гэта ягчэ ня усё, а праз некалькі дзён маюць ягчэ дадатковa прысласць лічбы насенных культур. Такія чынам, зараз прыходзіцца нанова перапрацоўваць пляны кантрактацыі, даваць мясцом новыя заданьні, старыя пляны касаваць і г. д. І зусім справядліва часта скардзяцца на мясцох на засілле паперов х дырэктыў, на супярэчнасьці.

Цікава спыніцца, што Белсельсаюз на лічыцца з тым, наколькі можна праводзіць кантрактацыю той ці іншай культуры. Як вядома, у нас узята ўстаноўка на кантрактацыю канаплі на асушаных балотах. У Менскай акрузе ёсьць толькі 17 гэкт. падрыхтаваных глеб, а Белсельсаюз даў заданьне закантрактаваць 50 гэкт. канаплі. Такім чынам, 33 гэкт. прыдзецца кантрактаваць на мінэральных глебах.

Перэальныя зьяўляюцца лічбы, вызначаныя па кантрактацыі канюшыны. Вызначана закантрактаваць 600 гэкт., але невядома, ці хопіць насеньня. Трэба было загадзя падрыхтавацца да гэтага, і ў выпадку недахопу насеньня канюшны вызначыць для кантрактацыі іншыя культуры.

Таксама будзе недарэчнасьць з кантрактацыяй кармавых буракоў на насеньне. Вызначана закантрактаваць 5 5 гэкт., а ў саўгасах і калгасах ёсьць буракоў на высадкі ня больш як на 2 гэкт. І тасьь рыхтаваліся да кантрактацыі буракоў, але справа не ўдалася і яе адк алі на другі год; «белета, як відаць, таксама належна не падрыхтаваліся да гэтай справы.

Сёлета ўвагачаецца асаблівая ўвага на кантрактацыю гартавога насеньня. Але што мы маем у гэтай галіне? Белсельсаюз да гэтага часу ніяк ня можа сабрацца, каб разьмеркаваць сартавы авёс, які забраніраваны на саўгасах Белсельтрэсту ў Менскай акрузе. Авёс гэты трэба неадкладна разьмеркаваць, бо да вясны асталося мала часу.

З гэтай справай ня трэба марудзіць.

Якім павінна быць сельска-гасп. крэдытнае таварыства!.

Старшыня праўленьня Белсельсаюзу т. Дубіна, які ўдзельнічаў ва ўсесаюзным зьезьдзе працаўнікоў сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту ў Маскве, у гутарцы з нашым супрацоўнікам адзначыў, што ў сувязі з разьвіцьцём крэдытнай і сел.-гаспадарчай кампаніі, побач з правадзінай спэцыялізаваньняй яе, паўстае пытаньне, што трэба зрабіць, каб пізоўка магла-б добра праводзіць крэдытную працу, кампаніраваньне насельніцтва, апэрацыі па збыту, снабжэньню і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

На 3-м усесаюзным зьезьдзе сыстэмы сел.-гасп. крэдыту ў Маскве некаторымі работнікамі было высунута пытаньне аб утварэньні чыстай крэдыткі, альбо нават райённага банку в раз рахункавымі функцыямі, каб мець адзіную банкаўскую сыстэму сел.-гасп. крэдыту без пасрэдніцкіх функцый на снабжэнча-збытавых апэрацыях. Сельска-гаспадарчы крэдыт павінен быць шчыльна і воцасрэдна зьвязан з усімі вытворчымі мерапрыемствамі па рэканструкцыі і кампэраваньню сельскай гаспадаркі.

Партыя і ўрад зацікаўлены і прымаюць усе практычныя захады па разьвіцьцю і ўзмацненьню ня толькі сацыялістычнага сэктару, але і пасобных сялянскіх гаспадарак, а таму неабходна ня толькі выдаць крэдыт, а і правесьць праз кампэрацыйны актыў і дапамагчы праз агранома, каб крэдыт быў скарыстаны матэзгодна.

Мы практыкуем выдачу крэдыту натурай: сел.-гасп. машынамі, насеньнем і інш. прадметамі, а сялянства ў значнай частцы павучкі таксама аварочвае натурай: хлебам, ільном, ільнонасеньнем і г. д. Мы праводзім праз пізоўку і кантрактацыю розных культур і прадукту сельскай гаспадаркі.

Калі мы павінны прыцягваць сродкі сялянства шляхам укладаў, задатакаў на набыцьцё сел. гасп. машын, насеньня, угнаеньня і на шэраг іншых гаспадарчых мерапрыемстваў праз сел.-гасп. крэдытныя таварыствы, а таму адарваная ад вытворчай с-г. кампэрацыі без пасрэдніцкіх функцый чыстае сел.-гасп. крэдытнае таварыства ня зможа выканаць гэту задачу. Пры гэтых умовах чыстая крэдытка страціла б твар і сэнс сел.-гасп. кампэрацыйнага крэдыту, механічна абарвалася-б у дзяржэўны сел.-гасп. банк з верхнімі яго зьвеньнямі сыстэмы, а гэта не адпавядала-б плану т. Леніна аб адзіным дзяржбанку. Тэма прыйшлося б побач з чыстымі крэдыткамі арганізаваць такую-ж па колькасьці спэцыяльную пізаную сетку збытавых таварыстваў сел.-гасп. кампэрацыі (як кр ытных функцый, чаго ні ў якім разе рабіць нельга, бо гэта ламала-б усю кампэрацыйную сыстэму на вёсцы і прымушала-б рабіць клікія дадатковыя выдаткі на ўтрыманьне апарату.

Дзеля таго, каб сел.-гасп. крэдытныя т-вы працавалі добра і маглі лепш справіцца з тымі задачамі, якія ўскладаны на пізоўку, не трэба наступова разгрузіць ад тых абавязкаў, якія павінны весьці спэцыяльныя саюзы сел. гасп. кампэрацыі (напрыклад., скуры, рогі, капыты, конскі волас, яйкі і інш.).

Адначасова з гэтым, трэба ажыўіць работу саветаў, праўленьняў і рэвізійных камісій, лепш арганізаваць работу кампэрацыйнага актыву вакол крэдытных таварыстваў і апошнія зьвязаць у рабоце в групамі бедноты і сельсаветамі.

Не дапушчаць частых зьмен старшынь крэдытных таварыстваў, выгнаць з пізоўкі дижкую складаную справаздачу і канцэлярщыну, якая не дае магчымасьці крэдытнаму таварыству займацца больш прадукцыйнай, жывой, гаспадарчай работай. Ускласьці, як правіла на аднаго з членаў праўленьня крэдытную работу, каб ён ёю кіраваў і за не адказваў пад агульным кіраўніцтвам і адказнасьцю ўсяго праўленьня. Пры гэтым неабходна пры праўленьні мець агранома для абслугоўваньня калгасаў, мэліярацыйных і машынных таварыстваў там, дзе гэта патрэбна.

Калі мы гэта зробім, а мы павінны гэта зрабіць тады крэдытнае таварыства пры дапамозе мясцовых партыйных і савецкіх органаў будзе добра прапаваць і зьявіцца сапраўдным арганізатарам кампэраваньня сельскай гаспадаркі.

АКТЫЎНАСЬЦЬ АШЧАДНАГА АПАРАТУ---ПЕРШАЯ НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ПОСЬПЕХУ КАМПАНІІ „ДВУХТЫДНЁВІКА АШЧАДНАСЬЦІ“.

С. І Яз. БАР.

ЛІТАРАТУРНЫЯ НАТАТКІ*).

„Полымя“ за 1928 г.

Пытаньнем крытыкі і неогул разгаду прыгожага пісьменства адведзена ў Полымі ў 1928 г. досыць значнае месца. Тлумачыцца гэта некалькімі моментамі. Напершае—1928 год адзначаецца значным ростам нашае літаратуры; у гэтым годзе выйшла некалькі вялікіх раманаў і аповесьцей. Падругое—адбыліся змены ў літаратурным жыцьці паогул, што адбілася і на пасобных арганізацыях: выліквідавана „Літаратурная Кануна“, арганізавана „Полымя“. Патрэцце—у гэтым годзе адбыліся юбілеі двох пралетарскіх беларускіх пісьменьнікаў: дзесяцігадовы юбілей Міхася Чарота і дваццацігадовы—Цішкі Гартнага. Усё гэта, само сабою зразумела, не магло не адбіцца і ў «Полымі». Асабліва значнае месца якраз займаюць артыкулы, прысьвечаныя юбілеям, і ў першую чаргу прысьвечаны Цішку Гартнаму. Гэты юбілей, лічым неабходным адзначыць, адбіў ў Полымі вельмі грунтоўна і ўсебакова (№ 9 і 10).

З усіх артыкулаў, прысьвечаных Ц. Гартнаму, на першым месцы бясспорна трэба паставіць артыкул А. Чарвякова—«Пясьняр змаганьня і змагар за Савецкую Беларусь». А. Чарвякоў сьпынаецца на тым, якую ролю адыгрывае творчасьць Ц. Гартнага, асабліва яго сатыры, у найбольш вострыя часы клясавага змаганьня. „Яго сатыра—гэта страшная зброя рэвалюцыі, бязьлітасная да ворагаў рэвалюцыі. Мне здаецца, што я не памылюся, калі скажу, што для засвойных у тыя часы у Менску беларускіх контр-рэвалюцыйных груп сатыра Цішкі Гартнага была амаль самым страшным воротам—значае аўтар.

Другія сталым артыкулам аб творчасьці Гартнага зьяўляецца артыкул С. Замбржыцкага—„Першы беларускі пралетарскі паэта і пісьменьнік“, дзе, на падставе разгляду твораў паэты, аўтар прыходзіць да вываду, што Гартны сапраўды зьяўляецца пралетарскім паэтам і пісьменьнікам. Артыкул С. Замбржыцкага зьяўляецца паогул амаль самым грунтоўным артыкулам аб творчасьці Ц. Гартнага, чаго дасюль мы амаль ня мелі.

Выключна мастацкай прозе Гартнага прысьвечаны артыкул Арк. Галя—«Тры этапы», дзе аўтар разглядае прозу Гартнага, падзяляючы яе на частупныя тры этапы: 1) перадрэвалюцыйная пара; 2) пара Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі; 3) перыяд сацыялістычнага будаўніцтва. Драматычным творам Ц. Гартнага прысьвечан артыкул праф. Ів. Замоціна (№ 9, дзе разьбіраюцца чатыры п'есы: «Хвалі жыцьця», «Сацыялістка», „На стыку“ і «Дзве сілы». Праф. Замоцін адзначае, што Гартны дае п'есы рэальна бытавога характару, досыць дынамічныя і добра сцэнізаваныя. Ц. Гартны (З. Жылуновіч) вядомы і як літаратурны крытык Гэтую яго галіну творчасьці разьбірае Ул. Дзяржынскі ў артыкуле—„Ідэйнасьць З. Жылуновіча у абсягу беларускае літаратурнае крытыкі“. Яз. Лёсік у артыкуле „Грам тычны склад мовы Цішкі Гартнага“ (№ 10, артыкул не скончаны) вынясена на асабліваецьцях мовы і набудовы сказаў у Гартнага. Нарэшце, М Малешка разглядае творчасьць юбіляра як гісторыка ў артыкуле—«З. Жылуновіч, як гісторык» (№ 10).

Вельмі цікавы артыкул Л. Клейнборта—«З шпуўшчыны беларускай грамадзкасьці». Хоць да яго і дадзены падзагаловак—«Да дваццацігодзьдзя літаратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага», але артыкул зьяўляецца ўспамінамі паогул аб некаторых моментах мінуўшчыны беларускай грамадзкасьці. Аўтар сам з Капыля, адкуль родам і Гартны, і дае шмат цікавага ў сваім артыкуле і аб жыцьці Капыля і капылян, і аб жыцьці ў вялікіх гарадох. Артыкул Клейнборта паогул вельмі цікавы і каштоўны.

Ёсьць крытычны артыкул З. Жылуновіча да 10-гадовага юбілею Міхася Чарота. — „Рэвалюцыйным шляхам“. У гэтым артыкуле разьбіраюцца ўсе творы Чарота, пачынаючы ад 1919 году. Разьбіраецца зборнік „Зьвіруха“, паэмы «Босыя на вогнішчы», „Лэнін“, „Чырвоныя крылы вяцчуць», «Марына», «Карчма», «Беларусь лапцюжная» і іншыя, вершы, а таксама і правічныя творы. Артыкул З. Жылуновіча зьяўляецца артыкулам крытычным у поўным сэнсе гэтага слова. (На вялікі жаль, такіх артыкулаў у нас аж дасюль амаль няма, а ёсьць артыкулы альбо тыпу анісальнага, альбо тыпу бессарэчнае зьнішкі). І „падрахоўваючы вынікі дзесяцігадовае літаратурнае дзейнасьці Міхася Чарота, — кажа З. Жылуновіч,—нельга з гонарам не пахваліцца яе буйнай высокай значнасьцю, яе вялікай каштоўнасьцю. Асобі М Чарота набывае ёю нязвычайнай сілы і выдатнасьці, займаючы адно з першых месц у гісторыі беларускае літаратуры“.

У сваім артыкуле „Ля вытокаў мастацкай прозы Якуба Коласа“ праф. А. Вазьнясенскі разьбірае два першыя крытыкаў з «Узвышша». Артыкул Глыбоцкага нічым не адрозьніваецца ад артыкулу М. Байкова.

Наша думка такая: на розныя выбрыкі, лаянку адкуль-бы яна ні ішла —ці то з «Узвышша», ці з іншага месца лепш не адказваць, памятаючы словы з аднае з баек Іа. Крылова: «полают и отстанут». Падобная-ж лаянка і склока, якую выклікае гэтая лаянка, для культурнае справы робіць адну толькі шкоду.

Другі артыкул Т. Глыбоцкага («Паэта, які падаваў надзеі» (пра Уладзіміра Жылку № 2), напісаны больш стала. Аўтар разьбірае зборнік вершаў Ул. Жылкі—«На палёх Зах. Беларусі» і правільна адзначае, што зьмест зборніку зусім не адпавядае назьве, якую Жылка прычаніў нама ведама з якою мэтаю.

М. Гарэцкі зьмясьціў артыкул — «Творчасьць маладнякоўцаў», дзе спыніўся па творчасьці двох маладнякоўцаў: Ліманоўскага і Моркаўкі. Артыкул апісальнага характару і значнае цікавасьці ня мае.

Надзвычайна цікавы і каштоўны па высунутай прабленне артыкул В. Сташэўскага—«Пісьменьнік — кніга—чытач» (№ 2). Аўтар і рарабіў вельмі цікавую працу: якога пісьменьніка і якія творы найбольш чытаюць і як паогул чытаюцца творы беларускіх пісьменьнікоў, в якою мэтаю былі абъяўлены чатыры бібліятэкі г. Менску. На падставе гэтага аўтар і робіць свае вывады. Ня лішне было-б, каб гэтая праца вывучэньня чытача была праведена на ўсебеларускім маштабе, каб мець поўнае ўяўленьне аб чытачу беларускае кніжкі. Гэтым павінны зацікавіцца як пісьменьніцкія арганізацыі, так і ўстановы, якія выдаюць кнігі.

Аб беларускай літаратуры за межамі БССР зьмешчан арт. М. Касьпяровіча «Беларуская літаратура ў Латвіі». Аўтар дае агульны нарыс аб жыцьці беларусаў у Латвіі і аб тэматыцы творчасьці паэтаў і пісьменьнікаў. Артыкул вельмі цікавы. Трэба толькі пажадаць, каб для азнаямленьня грамадзян Савецкай Беларусі з жыцьцём закардонных братоў былі зьмешчаны падобныя артыкулы і аб Польшчы і аб Літве.

Не прайшлі без адзнак і юбілеі такіх выдатных расейскіх пісьменьнікоў слова, як Л. Талстой і М. Г. Чарышэўскі. Першаму прысьвечаны арт. С. Вальфсона — «Да юбілею Талстога» (№ 7) і арт. праф. Ів. Замоціна—«Мастацкая творчасьць Л. Талстога». Юбілею Чарышэўскага прысьвечаны арт. праф. С. Вальфсона — „Аб Чарышэўскім рэвалюцыянэру і мысьліцелі“ і арт. Герчыкава — «Філёзофскія дэ гістарычныя погляды М. Г. Чарышэўскага».

У гэтым годзе ў Полымі назіраецца ягчэ адно каштоўнае і цікавае новаўвядзеньне—інфармацыйныя артыкулы аб замежнай пралетарскай літаратуры. Але трэба адзначыць, што матар'ялам гэты аддзел карыстаецца выпадковым, а сталай сувязі з замежнымі пралетарскімі літаратурнымі арганізацыямі і пасобнымі пісьнярамі няма. Так, няма інфармацый аб літаратурах Польшчы, Літвы, Латвіі і зусім выпадкова трапіў артыкул аб Японіі.

З артыкулаў найбольш пераважаюць жыцьцяпісы. Азнаямленьне з пасобнымі пісьнярамі—справа добрая, але калі пачынаюць аб некаторых даваць аж па два разы, то гэта ўжо псуе і агульнае ўражаньне. Агульныя інфармацыі аб замежнай літаратуры падазены наступным аўтараў: Удзаку Акіта—„Пралетарская японская літаратура“; Ф. Вейсконф—«Агляд чэхаславацкай літаратуры»; Герарт Поль —«Новая нямецкая проза».

Надалей трэба больш плянава даваць матар'ял аб замежных літаратурах, выкарыстаўшы для гэтага ўсе магчымасьці. У першую чаргу трэба падаць аб літаратуры бліжэйшых нашых суседзяў.

У публіцыстычным разьдзеле, апрача памянёных ужо некаторых артыкулаў, зьмешчаны яшчэ і працы па этнаграфіі, мовазнаўству і мастацтву.

Па этнаграфіі ёсьць два артыкулы: М. Пятуховіча—„Звычаі і песьні беларускага селяніна ў іх гаспадарчай аснове“; А. Дайлідовіча—„Сацыяльна-бытавыя матывы беларускіх народных казак“ (№ 6).

Па мовазнаўству зьмешчаны тры артыкулы: М. Байкова—„Аб нашай мовазнаўчай тэрміналёгіі“; Л. Акіншэвіча—«Да пытаньня пра беларускую юрыдычную тэрміналёгію» і Л. Ць

Ашчадны апарат павінен неадкладна праверыць сваю працу і падрыхтаванасьць да „двухтыднёвіка ашчаднасьці".

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра пераход непрамысловага будаўніцтва на подрадны спосаб пабудовы.

Эканамічная Нарада, у мэтах хутчэйшага пераходу непрамысловага будаўніцтва з гаспадарчага спосабу на подрадны спосаб пабудовы, і лічачы мэтагодным сканцэнтраваньне будаўнічых работ у існуючых будаўнічых арганізацыях, каб ухіліць ад паралелізму і непаравой канкуренцыі—згодна пастановы Савету Працы і Абароны за 15 кастрычніка 1928 г. (З. З. СССР 1928 г. № 63 арт. 630) пастанаўляе:

1. Абавязаць усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, пасьля аканчаньня ўжо начатых імі гаспадарчым спосабам работ на непрамысловым будаўніцтву перайсьці ў далейшым выключна на подрадны спосаб як пры новых пабудовах, так і капітальным рамонце. Мелкі бягучы рамонт можа вытварацца гаспадарчым спосабам.

2. Выкананьню азначаных у п. 1 будаўнічых работ на ўсёй тэрыторыі БССР ускласьці на існуючую будаўнічую арганізацыю Белдзяржбуд і на будаўнічы апарат Белжылсаюзу. Прымаючы пад увагу, што азначаныя арганізацыі ахопліваюць ужо найбольш буйное будаўніцтва на ўсёй рэспубліцы, маюць апрацаўны апарат ды на ўсіх акругах з інтэнсыўным будаўніцтвам і ўз'яднаць необходнымі абаротнымі сродкамі—лічыць арганізацыю новых будаўнічых вузлоў на тэрыторыі БССР нецэлясгобразным.

3. Для поўнага ахопліваньня Белдзяржбудам і Белжылсаюзам усяго непрамысловага будаўніцтва прапанаваць гэтым арганізацыям узмацніць сваю апэрацыйную дзейнасьць: Белдзяржбуду пераважна ў галіне прамысловасьці і ведамственнага будаўніцтва, а Белжылсаюзу пераважна ў галіне жыльёвага будаўніцтва з наступным расаўсюджваньнем дзейнасьці таксама на раёны, з такім разлікам, каб з 1929-1930 г. імі было ахоплена поўнасьцю ўсё будаўніцтва як новае, так і капітальны рамонт.

4. З прычыны значнага разьвіцьця будаўніцтва ў Менску захаваць часова існуючую будаўнічую арганізацыю Менскага Акрыканкому „Торгстройтрест" з тым, аднак, каб ёю было абслугоўвана будаўніцтва ў раёнах Менскай акругі.

5. Дзейнасьць гэтай пастановы не датычыць: а) прамысловага будаўніцтва і будаўніцтва электрычных станцый, б) спэцыяльнага транспартнага будаўніцтва на зямлях, прадастаўленых транспарту, в) будаўніцтва тэлеграфных, тэлефонных сетак і трансляцыённых радыёсетак, г) дарожнага будаўніцтва і д) будаўніцтва НКВенмору.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР В. Крыніцкі.

28 студзеня 1929 г., г. Менск.

Постановление Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

о переходе непромышленного строительства на подрядный способ производства работ.

Экономическое Совещание, в целях скорейшего перехода к промышленному строительству с хозяйственного способа на подрядный способ производства работ и считая целесообразным сконцентрирование строительных работ в существующих строительных организациях, во избежание параллелизма и нездоровой конкуренции—согласно постановления Совета Труда и Обороны от 15 октября 1928 г. (С. З. СССР 1928 г. № 68, ст. 630) постановляет:

1. Обязать все государственные учреждения и предприятия после окончания уже начатых ими хозяйственным способом работ по непромышленному строительству перейти в дальнейшем исключительно на подрядный способ как при новых постройках, так и капитальном ремонте. Мелкий текущий ремонт может производиться хозяйственным способом.

2. Выполнение означенных в п. 1 строительных работ по всей территории БССР возложить на существующую строительную организацию Белгосстрой и на строительный аппарат Белжилсоюза. Принимая во внимание, что означенные организации охватывают уже наиболее крупное строительство по всей республике, имеют оперативные аппараты во всех округах с интенсивным строительством и обладают необходимыми оборотными средствами—считать организацию новых строительных контор на территории БССР нецелесообразным.

3. Для полного охвата Белгосстроем и Белжилсоюзом всего непромышленного строительства предложить этим организациям укрепить свою оперативную деятельность: Белгосстрою преимущественно в области промышленности и ведомственного строительства, а Белжилсоюзу преимущественно в области жилищного строительства с постепенным распространением деятельности также и на районы, с таким расчетом, чтобы с 1929-1930 г. им было охвачено полностью все строительство как новое, так и капитальный ремонт.

4. В виду значительного развития строительства в Минске оставить временно существующую строительную организацию Минского Окружного Исполнительного Комитета „Торгстройтрест" с тем, однако, чтобы ею обслуживалось строительство в районах Минского округа.

5. Действие этого постановления не касается: а) промышленного строительства и строительства электрических станций, б) специально транспортного строительства на землях, предоставленных транспорту, в) строительства телеграфных, телефонных сеток и трансляционных радиосеток, г) дорожного строительства и д) строительства НК по Военным и Морским делам.

Председатель Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР В. Крницкий.

28 января 1929 г., г. Минск.

Не паўтараць памылак у кампанію „двухтыднёвіка ашчаднасьці"

Кампанія «двухтыднёвіка ашчаднасьці», якая будзе праводзіцца ў перыяд між 15-га лютага і 15-га сакавіка, зьяўляецца вельмі важнай і адказнай. Важнасьць гэтай кампаніі заключаецца хоць-бы ў тым, што яна павінна даць 2 з паловай міліёны рублёў на індустрыялізацыю нашай краіны. Зусім зразумела пагэтаму, чаму партыя і ўрад настойліва патрабуюць ад партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый прыняцьця самага актыўнага ўдзелу ў яе правядзеньні.

Важнасьць гэтай кампаніі завастрэцца яшчэ тэй акалічнасьцю, што першы квартал бягучага году даў вельмі незадавальняючыя вынікі у галіне ўцягненьня новых укладчыкаў і укладаў.

Зразумела, што посьпех гэтай кампаніі будзе залежаць ад таго, наколькі ёй будзе адлана ўвага з боку ўсёй грамадзкасьці. Разам з гэтым ад пахрытаванасьці самога ашчаднага апарату ня ў меншай меры будзе залежаць посьпех кампаніі.

Праведзены у мінулым годзе «двухтыднёвік ашчаднасьці» меў цалы шэраг недахопаў.

Улічыць памылкі мінулага году і не дапусьціць іх у гэтым годзе—зьяўляецца асноўнай задачай усяго ашчаднага апарату.

Да недахопаў, якія мелі месца ў мінулагоднім двухтыднёвіку, траба адносьці наступ.е:

Не ва ўсіх акругах БССР была праведзена належная падрыхтоўка да правядзеньня кампаніі.

У агіткампаніі меў месца гарадзкі ўхіл за кошт недастатковага абслугоўваньня вёскі.

Агіткампанія ня была ў дастатковай ступені ўвязана з матэдамі практычнага замацаваньня вынікаў агітацыі.

Ня было прынята мер да вылучаньня спэцыяльных кадраў прапагандыстаў са складу партыйнага, прафэсыянальнага актыву і сельскай інтэлігэнцыі.

Слаба ўдзельнічалі ў кампаніі касы ашчаднасьці пры філіялах дзяржбанку.

Слаба асьвятляўся ў друку ход і вынікі кампаніі.

Ня ўсюды былі ў належнай ступені актывізаваны ашчадныя касы пры прадпрыемствах п.-г. ведамстваў.

Недапушчальным праступкам было-б з боку ашчаднага апарату ня ўлічыць гэтых недахопаў і ня прыняць самых рашучых мер да таго, каб іх ня было ў гэту кампанію.

Ашчадны апарат у першую чаргу павінен зараз-жа праверыць усе свае зьвеньні і прыняць усе необходныя меры да таго, каб увесь апарат быў свечасова і належным чынам падрыхтаваны да правядзеньня гэтай кампаніі.

Падольскі

ХРОНІКА.

Рабочыя—ў партыю Леніна.

У ленінскія дні па Кастрычнікаўскаму райёну рабочыя фабрык і заводаў падалі 80 заяў аб уступленьні ў партыю Леніна, а іменна: ад рабочых заводу «Энэргія» 18 заяў, ад гарбарні „Бальшавік"—14 заяў, ад шчацінной фабрыкі—6 заяў, ад шклянога заводу „Пралетары"—5 заяў і г. д.

Партыйнымі ячэйкамі ўжо разгледжана і прынята ў партыю 35 чал.

МЕРАПРЫ�ЁМСТВЫ Д ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ЗЕРНАДАЧЫШЧЭНЬНЯ

Водлуг вестак з месц, на 22 га студзеня па асобных акругах было ачышчана: Полацкая акруга—3,2 проц. заданьня, Аршанская—8,9, Бабруйская—5,1 Магілёўская—8,4. Віцебская—8,8, Мазырская—21, Гомельская—5,0, Менская (да 1-га лютага) 9,6 проц. Усяго па БССР ачышчана 7367,8 тон, што складае 6,9 проц. заданьня. Апошняя лічба сьведчыць аб тым, што зернаачышчэньне пакуль што слаба разгарнулася на вёсцы.

Наркамзем пастанавіў выдаваць прэміі за поўную нагрузку трыераў, за свечасовую перасоўку і належную працу абозаў і інш. працу па ўзмацненьню зернаачышчэньня. Апроч гэтага, наапэрацыі і к-там сялянскай узаемадапамогі вызначаецца датацыя за бясплатнае зернаачышчэньне бядняцкімі гаспадаркамі.

Выплата выйгрышаў па 2 пазыцы Індустрыялізацыі

За 6 лютага выплачана Галоўнай Касай Ашчаднасьці БССР 115 выйгрышаў на агульную суму 4000 руб.

Паступленьне сельгаспадатку.

(Вестні дзюцца да 1 лютага).

Паступленьне падатку па Беларусі праходзіць пасьпяхова. У процантах адносінах падатак паступае так: Віцебская—96,7, Аршанская 95 3, Бабруйская 94,3, Менская 93.8, Магілёўская 93,4, Мазырская 93,4, Полацкая 92,5; на апошнім месцы стаіць Гомельская акруга, якая выканала заданьня на 80,1 пр. Агульны процант для ўсёй рэспублікі выканаўшых падатак раўняецца 92,3 Да паступленьня застаецца яшчэ досыць вялікая сума ў 735.579 рублёў. Месцы навінны адхаць максымум увагі, каб сельга-падатак узыскаць поўнасьцю на 100 проц. Асабліва трэба падцягнуцца Гомельская акр.

У БЕЛДЗЯРЖМУЗЭІ.

Знойдзен цікавы скарб.

Сёньня Азаровак, Пятрыкоўскага раёну, Мазырскай акругі, пераслаў у Беларускі Дзяржаўны Музэй знойдзены ім скарб вагой каля 5 фунтаў. Скарб складзен з манэт 16-га стагодзьдзя.

Зборнік «Стары Менск».

Белдзяржмузэй рыхтуе да выданьня зборнік „Стары Менск". У зборніку будуць зьмешчаны матар'ялы, характары ўсяго матар'яльную культуру жыхароў Менску з самых старых часоў да 19-га стагодзьдзя.

Арганізацыя навуковай рады пры Белдзяржмузэі.

Пры Белдзяржмузэі арганізавана навуковая рада ў складзе навуковых супрацоўнікаў музэю, прадстаўнікоў ад Галоўнаўкі і Беларускай Акадэміі Навук.

Мэта арганізацыі навуковай рады—кіраваньне навуковай працай музэю.

Падрыхтоўка да 5-цігадовага юбілею Мопр'у БССР.

Менскі акругком Мопр'у пачаў рыхтаванца да правядзеньня 5-цігадовага юбілею Мопр'у БССР. У дзень юбілею Менскі акругком пастанавіў выдаць 15 лепшым актывістам Мопр'у падарункі.

Пастаноўлена таксама паслаць прадстаўнікоў акругкому Мопр'у ў 12 раёнаў акругі для правядзеньня юбілею Мопр'у на вёсцы.

Пабудова клюбаў для батракоў

Прэзыдыум цэнтральнага праўленьня саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых пастанавіў пабудаваць у бягучым годзе 7 „даюў батракі" і 6 клюбаў у савецкіх гаспадарках. «Дамы батрака» будуць пабудаваны ў кожнай акрузе.

СУД.

ЗА АБРАБАВАНЬНЕ КААПЭРАЦЫЙНЫХ ГРОШАЙ.

Загадчык Траяноўскага аддзяленьня Халопяніцкага спажывецкага таварыства Аўсіевіч з пакоўчыкамі Белаўсам і Семашкам позна ўвечары 26 жніўня 1928 г. ехалі ў горад Барысаў па тавары для каапэрацыі.

У лесе паміж вёскамі Абча Бараны, Халопяніцкага раёну, Аўсіевіч заўважыў нейкія фігуры, але ня ўспаміваючы на мог добра разгледзець. Жалаючы упэўніцца, хто ідзе, ён выйшаў з воза і накіраваўся ўперад.

Раптам раздаўся крык: „Стой, ні з месца, будзем страляць!"

Пакоўчыкі Семашка і Белаўс затрымалі коні, а Аўсіевіч падаўся назад і таксама сустрэў са Бандыты на тупаючы на Аўсіевіча, накіравалі на яго вінтоўку і нагаі і загадалі ня рухацца.

Абшукаўшы кішэні Аўсіевіча бандыты, пагражаючы забойствам, забралі ў Аўсіевіча 387 р. каапэрацыйных грошай, якія ён меў пры сабе на закупку тавараў, адабралі у паясных гадзіньнік Аўсіевіча і зьнікі ў гушчары лесу.

У часе абрабаваньня пакоўчыкі Аўсіевіч прыкмецілі, што ў аднаго з бандытаў была сухая рука без кісьці пальцаў.

Аб рабунку было заяўлена ў міліцыю, а на другі дзень Халопяніцкай раённай былі затрыманы Іван Камоська і Мікалай Чарнуха, якія вінаватымі сабе ня прызналі; спасылаўся на алібі, пагрэ сьведкаў, што ўсюды, калі адбыўся рабунак, яны пасьпелі на начлезе коні, але акалічнасьць гэта не пацьвердзілася, на ночлег стаўня Аўсіевіч заказаў Камоську на голаду і на іншых аказаньках.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў г. Барысаве прыгаварыла: Івана Рыгораза Камоська і Міколу Пятрова Чарнуху па 247 п. 6 арт. КК на восем год зьняволеньня з суровым адмоваваньнем кожнага з пазбаўленьнем у правах на адбыцьці пакараньня на тры гады.

К.

Да барацьбы са шкодніками.

Сёлета на пасевах чысна рыхтуюцца да барацьбы са шкодніками ў часе вясенняй сяўбы. Для пратручваньня насеньня ад сажы ў кожным раёне будуць падрыхтаваны па 2 тэхніці з сялян. Апроч гэтага, да справы барацьбы з шкодніками мяркуюць прыцягнуць сельскія ячэйкі ТДА-Авіяхіму. Усяго сёлета мяркуецца пратруціць звыш 5 проц. насеньня пшаніцы-ярушкі, ячменю, аўса і проса.

Для выяўленьня гнёзд пашырэньня шкодніка сёлета мяркуюць арганізаваць карэспандэнцкую сетку ў 500 чалавек, якія павінны тэрмінова паведамляць аб небясьпецы, а таксама і самі праводзіць працу па барацьбе са шкодніками.

Да гэтага году акруговых інструктароў па барацьбе са шкодніками зусім ня было. Сёлета-ж уводзяцца 4 акруговыя штатныя інструктары. У часе пасяўной кампаніі будуць дзейнічаць 17 абозаў па барацьбе з садовымі шкодніками. Галоўная праца будзе праводзіцца ў балгасных і пасялковых садох.

Бесхельсагэ ужо заказаў мядзяны і жалезны купарвас, але трэба дабіцца, каб купарвас можна было атрымаць загадзя.

Культурныя навіны.

Набыцьцё карц'ін для Беларускага Дзярж. Музэю.

Галоўмастацтва намецілі закупіць для БДМ шэраг карцін з Беларускай мастацкай выстаўкі, а іменна карціны мастакоў—Аксэльрода, Эндэ, Тарасікава, Валло, Філіповича і інш. Усяго будзе набыта каля дзесяці карцін.

БДМ набыў карціну, пісаную на дрэве з надпісам «І. Р». Ёсьць думка, што пад ініцыяламі „І. Р." скрываецца прозьвішча вядомага прафэсара мазярства Яна Рустома, які ўпершыню на беларускае мазярства праз усю першую палову 19-га стагодзьдзя.

Карціна гэта выбражае краявід захоўпа-яменскага характару і, мабыць, напісана аўтарам у часе яго студыі ў Нямеччыне.

Новае аб'яднаньне мастакоў.

У Менску арганізавалася новае аб'яднаньне мастакоў—„Ромб"—т-ва Беларускага рэвалюцыйнага мастацтва. Мастакі, якія аб'ядналіся ў гэтым т-ве, ставяць сваёй мэтай адбіваць у сваіх творах эпоху нашай эпохі ва ўсіх галінах жыцьця.

У гэта т-ва ўваходзяць: з Масквы—мастакі Аксэльрод і Ахрэмчык, з Ленінграду—Юдовін і Шульц, з Менску—Грубэ, Бразер, Кашталінскі і Кудрэвіч.

Помнік бронзавага веку.

БДМ атрымаў ад Лепельскага краязнаўчага т-ва надзвычайна цікавы помнік бронзавага веку—бронзавы кельт, чні ўжываўся, як тапор пры розным працы і пры палявańні. На Беларусі да гэтага часу на куль што знойдзены 2 бронзавых кельты. Прысланы кельт ва свае апрацоўцы і па тыпу падобны на кельты прыбалтыцкай культуры.

Вывучэньне дыялекталёгіі Мазыршчыны.

ЦБ краязнаўства атрымала з Мазыру цікавы матар'ял на вывучэньню дыялекталёгіі Мазыршчыны. Матар'ял вынятае запісаныя словы і розныя віды народнай творчасьці 5 вёсак Нараўлянскага раёну і вылучаюцца каштоўным укладам у справу вывучэньня дыялекталёгіі округі.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

НЕПАТРЭБНЫЯ ВЫДАТКІ.

Бягомльскі РВК закупіў для пераваго млыну машыну. Машына ў перасьні месяцы, у часе бездарожжа, была перавезена з Койданава, што каштавала каля 1000 руб. Зараз машына знаходзіцца на двары, а ня ў працы.

Цікава, ці ня можна было-б дачакаць з перавозкаю да добрай дарогі, а калі перавозьці, то ці ня можна не чым-небудзь накрыць.

Шасцовы.

СОЛЬ З ГРАЗЬЗЮ, А МУКА З ГАЗАЙ.

Гэтакія тавары адпускае Сакалінская крама, Талочынскага спажывецкага т-ва пакупцам. Крама знаходзіцца ў вельмі маленькім памяшканьні; канцтаравары, замест таго, каб перавесьці краму ў другое памяшканьне, чакаюць і абяцаюць пабудаваць у „хуткім часе" новую.

М. Х.

ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ У БЯГОМЛЬСКАЙ БОЛЬНІЦЫ.

У Бягомльскай больніцы патрэбна была сястра. Загадчык больніцы т. Уласэвіч, замест выкананьня калектыўнай умовы, прыняў на службу сваю жонку, пачала самую.

Шасцовы.

БАЦЬКА—ГАНДЛЯР, А СЫН—КААПЭРАТАР.

Ляцянскае саматужна-крэдытнае т-ва адчыніла камісійную краму; загадчыкам яе назначае сын гандляра Хаім З., бацька якога мае патэнт 3 разраду.

Траба зьняць яго з працы.

М.

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ГАЗЭТ.

У чытальні Ляцянскага нарому заўсёды да 7 гадзін увечары ўсе газэты ўжо паразаны і німа магчымасьці іх чытаць. Чытаньню таксама заўсёды перашкаджае пастаянны шум у чытальні.

Неабходна прыняць меры да выбараньня газэт і ўпарадкаваньня чытальні.

Ярыца.

АД АСУШКІ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ЎРАДЖАЙ.

Каля вёскі Коршыка, Ляцянскага р-ну ёсьць вучастак сенажаці пад назвай „Паменкі". На гэтым вучастку сялянае трацілі шмат працы і мелі мала карысьці. Пры землеўпарадкаваньні вучастак быў перададзен пасёлку, які пад кіраўніцтвам агранома яго асушыў. Зараз ураджай сена лепшы добры і абяцае з кожным годам павялічвацца.

Гусінцаў.

БУДУЕМ НОВУЮ ВЁСКУ.

Вёска Альхоўка, Уваравіцкага раёну, зараз падзелена на два бакі. Пасёлкі пачалі будаваць бэтонныя студні, упалмуць хлявы і сенік кармавых травы.

КАРЫСНАЯ ПРАЦА АГРАНОМА.

У в. Коршыка, Ляцянскага раёну, агранам правёў шырокую растлумачальную працу аб карысьці засеву лавушыны і карыгодаў. Шмат сялян засеялі вокіт і лясеяц, у выніку чаго значна палепшыліся ўтрыманьне жывёлы.

Цяглаў.

ПАКАЗАЛЬНЫ ВУЧАСТАК.

На пасёлку «Ясная Рэчка», Ляц. р-ну арганізаваў сельска-гаспадарчы показальны вучастак. Для гэтага вучастку сялянае вызначылі 2 дасяціны зямлі, а сельска-гаспадарчае т-ва адпусьціла 15 кг. штучнага ўгнаеньня. На вучастку пад кіраўніцтвам райагранома пасеяны авёс і лён. Ураджай атрымаўся добры; гэта зьвяжуцца добрым прыкладам для навольных сялян.

Чарнякоў.

ПРАЦУ МОПР'у ТРЭБА ПАШЫРЫЦЬ.

Вільчынская ячэйка МОПР'у (Койданаўскага раёну), якая налічвае 65 чалавек, прыняла дагэтарэ для адбіцьця сродкаў на карысьць палітычных вязьняў. Ужо сабрана 41 руб Апроч таго, працы ячэйкі ўмацнела тое, што яна слаба працуе сярод заволочнага насельніцтва.

М. Кастусь.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Першы палёт над Паўднёвым канцавосьсем.

Як вядома, у канцы 1928 году на Паўднёвае канцавосьсе накіраваліся тры амэрыканскія экспэдыцыі, у тым ліку Барда і Вількінса. Зараз ужо атрыманы першыя весткі аб посьпеху гэтых экспэдыцый.

У палове сьнежня Вількінс з аэраплянам прыехаў на кітабойным судне да ледзянога перавалу, які абкружае ўвесь канцэнтэнт Паўднёвага канцавосься. Адгэтуль Вількінсу ўдалося зрабіць вялікі палёт на працягу звыш 1.000 кілёмэтраў над Паўднёвым канцэнтэнтам. Такія чыста, Вількінс заказаў, що атмасфэрныя ўмовы на Паўднёвым канцавосьсі дазваляюць карыстаць спосаб паветранага дасьледаваньня, хоць і з вялікімі цяжкасьцямі і нагрозамі. Экспэдыцыя Барда к канцу сьнежня дасягла берагоў Паўднёвага канцэнтэнту і з-раз ладзіць асноўную базу для палётаў і дасьледаваньняў навукоў Паўднёвага канцавосься.

Нямецкае радыёсудно „Цэрынгэн".

У Нямеччыне радыёсудном служа стары брэнаносец «Цэрынгэн», як адмоўнае роль плавучай мішэнны дзеля прыкрываньня флёту. На ім яшчэ ні гарматаў, ні мінных апаратаў. Усе памяшканьні забіты пробкай.

На камандным мастку судна ўстаноўлены вельмі чулыя прылады, якія могуць прымаць радыё-сыгналы (напрыклад, па тэлеграфній азбуцы Морзэ) на далёкай адлегласьці. Прыняўшы сыгнал, тая або іншая прылада можа ўключыць ток і пусьціць у ход патрэбную машыну.

Судно «Цэрынгэн» можа выконваць 72 розныя каманды... Пры самай цішыні ні нясарэўнасьці катлоў, або нават на судне зараз-жа суцімаецца і вылучае сьмяшныя ракеты.

Каманда падвешана на радыё з мінаносца на адлегласьці 10 кілёмэтраў.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. «Зязюля-лапатуня» Юр. Будзька. Дзіцячыя кнігі. Цана 25 кап.

2. „О анг збаўца". Пад редакцыяй Ів. Цьвіковіча. Стар. 125, цана 35 кап.

3. „Рыбак". Аляксандровіч. Дзіцячыя кнігі. Цана 35 кап.

4. «Аб павялічэньні ўраджайнасьці» Я. А. Якаўлеў. Д клас на чацвертай сесіі ЦВК Саюзу ССР 4-га скліканьня. З дадаткам пастановы ЦВК СССР. Стар. 55, цана 25 к.

Адказы карэспандэнтам.

Тутэйшаму. Допіс—„Дзікі рэжым эканомікі"—накіравана ў Белдзяржбуд.

Сарэку. Зроблен запыт у Менскай Акрміліцыі, а ваша прапанова перасланa ў Нар. Ком. Гандаль.

Мішуру, Аб карэспадэнцелях перасланa ў Наркамюст.

Ч—ну. Заметка аб неправільнасьці в ільготамі перасланa ў Бабруйскі АКРЗА на расьсьледаваньне.

Сялькору. Допіс—аб раённаваньні накіравана ў Магілёўскі Акрвыканком.

Аўтару. „Хто забаравае" накіравана ў ЦБ саюзу савгаспслужачых.

Бязымянному. Аб сьвіцілаўскай школе накіравана Гомельскаму Акрнаросвіту Асьветы.

Ціхаму. „Рабочым асвядамляўся"—перасланa Мазырскаму саюзу працаемлеу.

Ячменаву. „Закіпуты куток"—накіравана у Арганскую РСІ.

Цагельнікану. На ваша запытаньне Цэнтральная Выбарчая Камісія тлумачыць, што члены сем'і былых нежаўных служачых пазбаўляюцца выбарчага права.

ПАПРАЎКІ.

У № 29 нашай газэты—за 7 лютага г. г. у аддзеле — «Узмацніць падрыхтоўку да сяўбы»—надрукавана: «У Хойніцкім раёне вычысьці насеньня ці пачалі», а павінна быць—«У Хойніцкім раёне»... (Гомельскай акр.).

Ва ўчарашным № „Сав. Бел." у загалоўку інфармацыйнае заметкі з Лёдаду (3-я зьнізу на 1-2 кал.) здарылася прыкрая апечатка. Надрукавана «Бунт проці БЫЛЫХ экспэдытатараў, трэба-ж—..проці БЕЛЫХ экспэдытатараў.

Апавяшчэньні.

ВАЙСКОВЫ ГАБІНЭТ БДУ.

Студэнты ўсіх курсаў і факультэтаў БДУ (мужчыны і жанчыны), за выключэньнем чацьвертага курсу жанчын Педфаку Права і Гаспаларкі, якія не запоўнілі да гэтага часу статыстычныя карткі, павінны запоўніць іх у ваенным габінэце.

Апошні тэрмін запаўненьня 9-га лютага г. г., пасьля чаго ўсе тыя, што не запоўняць статыстычных картак, будуць лічыцца ўхіліўшыміся ад вучоту.

Вайсковы габінэт працуе ад 9 да 2 гадзіны дня і ад 4 да 8 гадзіны вечара.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

У нядзелю, 10 лютага, а 12-й гадзіне дня ў клюбе Навук. Працаўнікоў (Камуністычная, 17) адбудзецца агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску.

Абвестка дня:

1. Даклад адказн. сакратара Ў сесіяй Асацыяцыі „Варнітса" праф. Б. І. Зёрнова аб ролі інтэлігэнцыі ў сацыялістычным будаўніцтве і задачы «Варнітса».

2. Выбары дэлегатаў на IV-ы Усесаюзны Зьезд Навуковых Працаўнікоў.

3. Выбары дэлегатаў на III-ці Усесаюзны Зьезд Навуковых Працаўнікоў.

4. Бягучыя справы.

Яўка сяброў сэкцыі абавязкова.

Запрашаюцца ўсе работнікі Навукі і Тахнікі.

ЦБ СЭКЦЫІ НАВУК. ПРАЦАЎНІКОЎ.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, пастаноўка калектыву расейскай драмы «Вясельле без шлюбу».

Білеты ад 50—20 к. Пастаноўка Растоўцаеа.

Пачатак а 9 гадзіне.

ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня а 19 гадзіне адбудзецца сход сэкцыі па самаіраваньню і пінаэруху. Парадак дня: «Новыя формы і аб'ект працы вучнёўскіх самаарганізацый ЦДШ».

Запрашаюцца загадчыкі школ. Усе настаўнікі. Прысутнасьць усіх сяброў сэкцыі, прымаючых да самаіраваньня настаўнікаў і вакатых фармостаў абавязкова.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

ПЯТНІЦА, 8 ЛЮТАГА

ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ.

Білеты, узятыя ў рабочай касе на „Стралок Тэль", маюць сілу на нядзелю 10 лютага на спэктакль „Каваль ваявода".

КІНО «КУЛЬТУРА». З АЎТОРКА „ПЕРШЫ КАРНЭТ СТРАШНЁЎ"

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». „ЗАГАДКА МЛЫНУ" з удзелам ПАТ і ПАТАШОН у 6 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ „ШЛЯХ ДА ЗДАРОЎЯ І КРАСЫ". Пачатак а 7 гадз. ўвечары.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). З АЎТОРКА „ТАНЬКА ШЫНКАРКА" у 6 частках.

Будаўніцтва новых фабрык і заводаў па харчовай прамысловасьці.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам загалчык эканамічна-вытворчага аддзелу Белхарчтрасту аб будаўніцтве новых фабрык і заводаў па харчовай прамысловасьці БССР паведаміў наступнае:

Белхарчтрэст прыступіў да падрыхтоўчых работ па пабудове макаронай фабрыкі ў Барысаве і заводу па вырабу віна з садавіны ў Воршы. Апрача гэтага, у працягу бліжэйшых месяцаў будзе прыступлена да падрыхтоўчых работ па пабудове крахмальнага заводу на ст. Буда-Кашалёўская (Бабруйшчына) і ф-кі кандытарскіх вырабаў у Менску.

Макаронная ф-ка будуецца ў памяшканьні быв. дражджавога заводу імя Леніна. Вытворчасьць яе—каля 800 пуд. у суткі.

Завод па вырабу віна з садавіны і ягад у Воршы будуецца ў памяшканьні быв. броварнага заводу „Спартак". Вытворчасьць заводу — 20000 вёдзер. Завод будзе пушчан у лістопадзе бягучага году. Абсталяваньне для гэтага заводу ўжо заказана заграніцай.

Пабудова фабрыкі кандытарскіх вырабаў пачнецца ў красавіку—маі з разьлікам, каб скончыць яе да кастрычніка 30 году. На фабрыцы кандытарскіх вырабаў будзе занята 460 чалавек пры працы ў адну зьмену і каля 900 чалавек—пры пераходзе на дзьве зьмены. Вытворчасьць ф-кі—3500 тон кандытарскіх вырабаў у год пры працы ў адну зьмену. У бягучым годзе будзе выведзен галоўны корпус фабрыкі. Белхарчтрастам ужо заказана абсталяваньне для гэтай фабрыкі.

Апрача гэтага, ў бягучым гаспадарчым годзе Белхарчтрэст працягне будаўнічыя работы на будаўніцтву вялікага маслабойнага заводу ў Віцебску і крахмальнага заводу—у Чырвоным - Беразе (Бабруйшчына). Маслабойны завод будзе пераапрацоўваць 750000 пуд. ільнянога насеньня у год. Завод будзе скончан да 1 кастрычніка 30 году, г. зн. да часу пуску электрастанцыі імя Сталіна, якая будзе даваць энэргію заводу. У бягучым будаўнічым сэзоне на заводзе мяркуецца закончыць галоўны корпус, кантору і сталовую для рабочых і распачаць абсталяваньне гэтага заводу. Абсталяваньне для заводу ў большай частцы зроблена на заводах Савецкага Саюзу. Апрача таго, у бягучым годзе на гэтым заводзе будзе распачата пабудова механічнага сьвірна для насеньня з ачышчальнай станцыяй на 200000 пуд. Крахмальны завод у Чырвоным-Беразе будзе пушчан у кастрычніку бягучага году. Завод будзе апрацоўваць 5000 пуд. бульбы ў суткі.

Разьвіцьцё торфа-распрацовак.

На Міхнавіцкім балоце ў сёлетнім годзе ўстаноўляюцца 2 новыя тарфяныя гарнітуры. Тут будзе занята 4 арцелі, усяго каля 120 чалавек, што дасьць магчымасьць падрыхтавець грабароў-беларусоў.

У бл. эшае 5 пігодзьдзе будзе зьвернута асаблівая ўвага на разьвіцьцё торфаздабываньня на падсьпіх для скацины. Мяркуецца давесьці здабываньне торфу на падсьпіх да 25 мілёнаў пуд для ўгнаеньня 10.000 гакт. зямлі.

Пастанова

Прэзыдыуму Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту

Гор. Менск. 29 студзеня 1929 г.

аб зьбіраньні попелу на ўгнаеньне.

Прэзыдыум Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Абавязаць усе дзяржаўныя і каапэратыўныя ўстановы і прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Менскай акругі, зьбіраць і захоўваць увесь попел, які атрымоўваецца ад дрывянога апалу.

Попел хаваць у сухіх памяшканьнях, напрыклад: магчымасьць пажараў.

2) Сабраны попел рэгулярна здаваць дармова саўгасам, калгасам, мазіарапыным т-вам, пасёлкам і пасобным гаспадарам на ўказаньні Акруговага Зямельнага Аддзелу і Раённых Выканаўчых Камітэтаў.

Старшыня Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ЯЦКЕВІЧ.

Час. в. аб. Сакратара Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту МАЙСЕЯЎ.

Браткоўскі сельсавет, Капыльскага р. паведамляе гр-на Мохава Хведара Мак., што на 18-га лютага 1929 г. назначана справа аб скасаваньні шлюбу з жонкай яго гр-кай в. Братчына Мехавой Ганнай Аляксеяўнай.

Менскі ЗАГС выклікае на 5 сакавіка 1929 г. гр. Кяткоўскага Вацлава Яна ага на справе скасаваньня шлюбу з гр. Кяткоўскай Марыяй Сямёнаўнай.

ЗГУБЛЕНЫЯ.

— Сяброўская кніжка „Зьмічка" Дзікана І. Н.

— Вайсковая страхавк. кніжка і запрыўная кніжка Міхіцкага Х. С.

— Сяброўская кніжка Крукоўскага М. П., выд. Мазырск. саюзам працаеветы.

— Сяброўская кніжка № 953 Хайтмана М., выд. Мазырск. с.-гасп. т-вам.

— Матрычн. выпіс Шэхтмана Х., выд. Мазырск. Загсам.

— Каапэрац. кніжка Чыржіна П. А., выд. Мазырск. ЦРК.

— Сяброўская кніжка Шульмана М. А., выд. МЦРК.

— Лоцкая кніжка [illegible] Ў. Н., выд. Мазырск. страхкасай.

— Сяброўск. кніжка Каміньскай Р. М., выд. Мазырск. саюзам працаеветы.

— Дапрывыўная кніжка № 407 Зарэнкага Г. С.

— Каапэр. кніжка Брыкмана Г. М., выд. Мазырск. ЦРК.

— Каапэрац. кніжка Гоўштэйна Ш. Ю., выд. Мазырск. ЦРК.

— Квіты за № 9068, 9069, 9070 Цунтуса Я., выд. Азар